ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Нядзеля 6 сакавіка 1938 г., № 13 (355)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

РАСЦІСНУЦЬ АГІДНУЮ ГАДЗІНУ!

Ужо некалькі дзён Ваенная калегія Вярхоўнага суда СССР разглядае справу подлай банды забойцаў і шпіёнаў з антысовецкага «права-трацкісцкага блока». На кожным новым пасяджэнні раскрываюцца ўсё новыя і ўсё больш мерзкія і гнусныя падрабязнасці агіднейшай работы прадажных азвярэлых ублюдкаў, агентаў фашызма.

Разматваецца гніючы клубок, сплецены з трацкісцкіх, бухарынскіх, эсэра-меншавіцкіх і буржуазна-нацыяналістычных выродкаў, якія оптам і ў розніцу гандлявалі нашай свяшчэннай зямлёй, нашай вялікай радзімай, нашым жыццём і лёсам.

З цынічным спакоем, прыцісНутыя логікай фактаў і доказаў, расказваюць перад судом прэзрэнныя мярзаўцы аб сваіх найподлых, агіднейшых дзеяннях.

Па заданнях крывавага сабакі фашызма Іуды-Троцкага, па заданнях генштабаў і паліцэйскіх ахранак падпальшчыкаў вайны, асленленыя звярынай злобай і нянавісцю да соцыялістычнага ладу, прадажныя бандыты гандлявалі свабодай народаў Совецкага Саюза, прадавалі замежным разведкам совецкія дзяржаўныя тайны, падрыхтоўвалі і праводзілі гнюснейшыя забойствы перадавых, лепшых людзей нашай краіны.

Як трэба нізка пасці, наколькі трэба быць мерзкім і спустошаным духоўна, каб апусціцца да самых бесчалавечых агідных учынкаў! Чалавецтва не ведала яшчэ падобнага падзення, падобнага вераломства і здрады. У самых фантастычных творах сусветнай літаратуры аб здрадзе і цынізме не выведзена больш злачынных і мерзкіх тыпаў.

Аляксей Максімавіч Горкі, чыё жыццё абарвалі ядавітыя гадзіны з трацкісцка-бухарынска-рыкаўскай банды, у сваім артыкуле «Аб здрадніках» пісаў:

«... Здраднік, гэта настолькі своеасаблівае, агіднейшае стварэнне прыроды класавай дзяржавы, што параўнаць здрадніка няма з кім і з чым. Я думаю, што нават тыфозную вош параўнанне са здраднікам абразіла-б».

Прадстаўшыя перад совецкім правасуддзем здраднікі ні ў якое параўнанне не ідуць з вядомымі да гэтага часу злачынцамі. Па дваццаць і трыццаць год весці самую агідную двурушніцкую работу — гэта зашмат нават для самага незвычайнага здрадніка. Трэба не мець нічога чалавечага, трэба згубіць усе чалавечыя рысы, каб весці падобную подлую і агідную здраду.

Найподлыя з подлых, яны не спыняліся ні перад якімі злачынствамі. Яшчэ ў дарэволюцыйныя часы Зеленскі, Іваноў, Зубараў служылі царскай жандарскай ахранцы, выдавалі рэволюцыйных барацьбітоў. У 1918 годзе Іуда-Троцкі і ірад Бухарын прабавалі абязглавіць рэволюцыю, арыштаваць і забіць Леніна, Сталіна і Свердлова, нізвергнуць совецкі ўрад, каб устанавіць панаванне памешчыкаў і капіталістаў у нашай краіне.

Праз усе дваццаць год рэволюцыі і соцыялістычнага будаўніцтва цягнецца мерзкая работа прэзрэнных шпіёнаў, двурушнікаў, буржуазных нацыяналістаў, ворагаў комуністычнай партыі і совецкага народа. Прадаўшыся замежным разведкам, гэтыя выродкі, шпіёны і забойцы паставілі сваёй мэтай шпіянаж, шкодніцтва, тэрор, дыверсію, падрыў магутнасці СССР, правакацыю нападу фашысцкіх дзяржаў на Совецкі Саюз, расчляненне СССР і адрыў ад вялікага Совецкага Саюза квітнеючай Украіны і Беларусі, сонечных Грузіі і Арменіі, Азербайджана, Сярэдне-Азіяцкіх рэспублік і фарпоста СССР на Далёкім Усходзе — Прымор'я.

З цынічнай сухасцю расказвае мацёры агент польскай дэфензывы Шаранговіч аб тым, як беларускія нацыянал-фашысты вялі падрыўную дыверсійную работу ў калгасах і на прадпрыемствах Совецкай Беларусі. Адарваць заходні фарпост Совецкага Саюза — квітнеючую, шчаслівую і радасную Совецкую Беларусь ад СССР,ператварыць яе ва ўбогую і забітую калонію польскага і нямецкага імперыялізма было мэтай гэтых подлых здраднікаў народа. Лёс Заходняй Беларусі, якая стогне пад ботам і бізуном польскіх катаў, рыхтавалі фашысцкія наймиты вольнай Совецкай Беларусі.

Слаўныя совецкія разведчыкі на чале са сталінскім наркомам Н. І. Ежовым разбурылі смярдзючае гняздо гадаў. Ворагі выкрыты. Яны прадсталі перад совецкім правасуддзем.

Разам з усімі народамі вялікага Совецкага Саюза беларускі народ шле праклянцце мярзаўцам, забойцам, гандлярам нашым шчасцем, нашымі заваёвамі і поспехамі.

Пад сцягам партыі Леніна—Сталіна, сагрэтыя сталінскай бацькоўскай увагай і цеплынёй, беларускі народ будаваў, будуе і будзе будаваць сваю дзяржаўнасць, сваю нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу культуру ў дружнай і братняй сям'і народаў вялікага Совецкага Саюза. Ніякім гадам не ўдасца ажыццявіць сваіх звярыных замыслаў! Нікому не ўдасца адарваць Совецкую Беларусь ад Совецкага Саюза! Хто наважыцца зрабіць гэта, той будзе расціснуты, як гадзіна, як погань.

Галерэя мерзкіх гадаў праходзіць перад Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда. Подлыя, прадажныя, цынічныя, труслівыя, яны заслугоўваюць толькі адной кары — смерці.

У тысячах і сотнях тысяч рэзалюцый і пісем працоўных нашай краіны чуецца адно адзінае і законнае патрабаванне — расціснуць гадзіну, знішчыць банду!

8-е САКАВІКА

8 сакавіка—Міжнародны комуністычны жаночы дзень. У краіне соцыялізма гэты дзень з'яўляецца ўсенародным святам, святам вольнай і шчаслівай совецкай жанчыны і святам міжнароднай салідарнасці совецкіх жанчын з працоўнымі жанчынамі капіталістычных краін, дзе пануе жорсткая эксплаатацыя і прыгнёт, бяспраўе і фашысцкі тэрор.

Сваімі слаўнымі дочкамі ганарыцца наша радзіма. Увесь Совецкі Саюз ведае імёны гераінь соцыялістычнай працы, стаханавак Дземчанка, Ангеліну, Вінаградавых і многіх, многіх іншых; жанчын-лётчыкаў, жанчын-майстроў мастацтва, жанчын-вучоных, лепшых прадстаўніц усіх народаў вялікага Совецкага Саюза. Сваіх лепшых дачок беларускі народ абраў дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР, узняў на самую высокую ступень дзяржаўнай дзейнасці. Стаханаўкі нашых заводаў і калгасаў, выхаваныя партыяй Леніна—Сталіна,—О. Багачова, М. Лёліна, С. Рачок, Н. Лісунова і іншыя—партыйныя і непартыйныя большэвічкі—сталі дзяржаўнымі дзеячамі. «Такіх жанчын не бывала і не магло быць у стары час» (Сталін).

У параўнанні са змрочным мінулым працоўнай жанчыны ў царскай Расіі, у параўнанні з бяспраўным, рабскім становішчам жанчын ў капіталістычных краінах асабліва ярка вырысоўваюцца надзвычайна вялікія дасягненні жанчын СССР, веліч тых правоў нашай жанчыны, якія заваяваны і запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі, тых клопатаў, якія аказвае наша краіна жанчынам-мацерам, той увагі, якой атулена кожная жанчына ў СССР.

На фабрыках і заводах, на фронце навукі і мастацтва, у прыгранічнай паласе—усюды нашы жанчыны плячо ў плячо з мужчынамі змагаюцца за новыя перамогі соцыялізма, за яшчэ большы росквіт радзімы, за моц і непарушнасць нашых граніц.

Міжнародны комуністычны жаночы дзень будуць адзначаць і перадавыя рэволюцыйныя жанчыны капіталістычных краін. Жанчыны рэспубліканскай Іспаніі на чале з мужнай комуністкай Далорэс Ібаруры адзначаць гэты дзень у агні баёў з фашысцкімі інтэрвентамі, барацьбой за вольнае і шчаслівае жыццё. Днём далейшай барацьбы з агрэсарам—японскімі фашысцкімі налётчыкамі—будзе 8 сакавіка для працоўных жанчын Кітая. Пролетаркі-рэволюцыянеркі ўсіх капіталістычных краін прадэманструюць у гэты дзень сваю нянавісць да фашысцкіх падпальшчыкаў вайны і іх подлых трацкісцкіх агентаў, прадэманструюць гатоўнасць да барацьбы за дэмакратыю, за мір, супроць фашызма. Яны правядуць гэта свята пад лозунгам умацавання і пашырэння адзінага народнага, антыфашысцкага фронта.

Совецкія жанчыны не раз паказвалі прыклад салідарнасці з працоўнымі жанчынамі Захаду. Яркі прыклад—арганізацыя дапамогі жанчынам і дзецям гераічнай рэспубліканскай Іспаніі. І дзень Міжнароднага комуністычнага жаночага свята з'явіцца днём далейшага ўмацавання братняй міжнароднай пролетарскай салідарнасці.

Перад работнікамі нашай літаратуры і мастацтва стаіць задача: паказаць у сваіх творах і работах тыповыя вобразы новых жанчын, гераінь нашай соцыялістычнай краіны, вобразы мужных пролетарак-рэволюцыянерак капіталістычных краін.

У совецкай літаратуры ёсць удалыя спробы паказаць вобраз новай жанчыны. Гэты вобраз (Агрыпіна) мы знаходзім у аповесці А. Талстога «Хлеб». У нашай беларускай літаратуры пісьменнік К. Чорны напісаў аповесць «Люба Лук'янская». Над паэмай пра совецкую жанчыну працуе П. Броўка. Але гэта не вырашае задачы. Стварэнне вобраза совецкай жанчыны ў нашым мастацтве—першачарговая задача дня.

Совецкі народ шле палкае прывітанне гераічным жанчынам рэспубліканскай Іспаніі і ўсім рэволюцыйным жанчынам капіталістычных краін.

Совецкая жанчына ў дзень свята прадэманструе сваю адданасць радзіме, сваю вернасць партыі Леніна—Сталіна, прадэманструе перад усім светам, што фашысцкім наймітам, шпіёнам і забойцам, трацкісцка-бухарынскім, нацыянал-фашысцкім гадам не ўдасца пазбавіць яе правоў, заваяваных і запісаных у Сталінскай Канстытуцыі. Совецкая жанчына прадэманструе сваю гатоўнасць у любы момант стаць на абарону граніц квітнеючай краіны соцыялізма.

Слава патрыёткам нашай радзімы, дочкам вялікага совецкага народа!

МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА ДА СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ

Аргкамітэтам Саюза совецкіх мастакоў Беларусі да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота 23 лютага ў Менску, у Доме мастака, адкрыта выстаўка выяўленчага мастацтва. На выстаўцы прадстаўлена больш пяцідзесяці жывапісных і скульптурных твораў.

Частка выстаўленых работ была ўжо экспаніравана на папярэдніх выстаўках, дзе яны прыцягвалі да сябе ўвагу совецкай грамадскасці як сваім ідэйным напрамкам, так і формай жывапіснага і скульптурнага выражэння.

Іншыя жывапісныя і скульптурныя работы выстаўлены ўпершыню. Гэтыя работы таксама прыцягнуць да сябе ўвагу наведвальнікаў выстаўкі.

Галоўнай асаблівасцю выстаўкі з'яўляецца тое, што вялікія жывапісныя палотны і скульптуры прысвечаны грамадзянскай вайне, перыяду вызвалення Беларусі ад нямецкіх і польскіх імперыялістычных акупантаў.

Разгрому інтэрвентаў і белагвардзейцаў прысвечаны аднайменныя палотны мастакоў Ахрэмчыка і Манасзона — «Уваход Чырвонай Арміі ў Менск у 1920 годзе», дзве карціны Гедда — «Атака» і «Палонны Будзённага», Ціхановіча — «Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам», Бржэзоўскага — «Атака», Гаўрыленкі — «Засада партызанаў», Дучыца — «Партызаны», «Засада» і «Разбраенне белагвардзейцаў», Заборава — «Чапаеў» і вялікі барэльеф Бембеля на тэму «Вызваленне Беларусі ад белапалякаў».

Паказу сёнешняга дня Чырвонай Арміі прысвечаны работы мастакоў Пашкевіча — «Варашылаў на парадзе Беларускай ваеннай акругі», Тычыны — «Паветраны дэсант», Зальцмана — «На аэрадроме», Бржэзоўскага — «Чырвонаармейскі лагер» і «Танкі», Красоўскага — «Закладка Дома Чырвонай Арміі ў Менску», вялікая скульптурная група Глебава «Лявоніха».

Выстаўлены партрэты кіраўнікоў і арганізатараў Чырвонай Арміі. Мастак Волкаў выставіў жывапісны партрэт Леніна, Кругер — партрэт Орджанікідзе, скульптары: Азгур—бюсты Сталіна і Кагановіча, Бразэр — бюст Кірава, Анжэлевіч — бюст Сталіна, Глебаў — скульптурную работу «Варашылаў на кані».

Усе гэтыя работы па сваёй ідэйнай мэтанакіраванасці і палітычнаму напрамку адзіныя, па форме і сіле выражэння розныя. Палітычна правільны паказ жывапісцамі і скульптарамі гераічнай барацьбы Чырвонай Арміі з інтэрвентамі і белагвардзейцамі ў мінулым, жыцця Чырвонай Арміі ў мірны час пераконвае наведвальнікаў выстаўкі ў тым, што совецкі народ біў інтэрвентаў у мінулым, будзе з яшчэ большай сілай і энергіяй біць у будучым. Гэтыя работы дэманструюць магутнасць і сілу ўзброенага совецкага народа, які пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна нанясе сакрушальны, знішчаючы ўдар ворагам, калі яны асмеляцца напасці на нашы рубяжы. У гэтым палітычна-выхаваўчая каштоўнасць жывапісных палотнаў і скульптурных работ, экспаніраваных на выстаўцы.

З боку закончанасці, аддзелкі, выяўлення характараў тыпажу гэтых работ адны з іх у большай, другія ў меншай ступені носяць яшчэ эскізны характар.

Майстэрства, з якім выканаоы работы, гаворыць аб тым, што беларускія мастакі, асабліва маладыя, удасканальваюць сваю кісць і стэку (разец), авалодваюць складанасцю кампазіцыі і іншымі прыёмамі жывапіснага і скульптурнага выяўлення.

У работах жывапісцаў Ахрэмчыка і Манасзона, трактуючых адну і тую-ж тэму — уступленне Чырвонай Арміі ў Менск у 1920 годзе, шмат агульнага, але шмат і рознага. Іх яднае адна і тая-ж палітычная накіраванасць, у іх паказана цесная сувязь совецкага народа са сваёй роднай Чырвонай Арміяй. Яны і напісаны амаль з аднолькавай сілай майстэрства. Розныя-ж яны па сюжэту, па тыпажу, па кампазіцыі і па колеру. Награмаджэнне Ахрэмчыкам у сваёй карціне, прытым у адказным месцы — на пярэднім плане, штацкіх фігур, пастаўленых да гледача спіной, і карычневы каларыт утойваюць, засмяняюць уступаючыя ў горад чырвонаармейскія рады. Патрабуецца пільны разгляд карціны, каб разабрацца, што да чаго. Карціна-ж Манасзона лепш глядзіцца, бо ў ёй на пярэднім плане паказаны рады чырвонаармейцаў у руху, масы сустракаючага насельніцтва, за выключэннем двух жанчын, размешчаны ў баку і ўзяты яны ў больш светлых тонах.

Цікавы па сваёй кампазіцыі эскіз Пашкевіча да будучай вялікай карціны «Варашылаў на парадзе Беларускай ваеннай акругі». Гэта работа сведчыць аб тым, што таленавіты мастак перайшоў да вялікіх палотнаў і сур'ёзных тэм. Пажадаем яму поспеху ў гэтай справе.

Мастак Гэдда — сталы ўдзельнік нашых выставак. Ён зарэкамендаваў сябе як жывапісец-баталіст. Выстаўленыя ім карціны «Атака» (дзве) і «Палонны Будзённага» маюць вялікае выхаваўчае значэнне. У іх зарысаваны сцэны з эпохі грамадзянскай вайны і выгнання белапалякаў з Беларусі. Такія карціны выхоўваюць у гледача любоў, палкі патрыятызм да соцыялістычнай радзімы, прывіваюць нянавісць да рознага роду інтэрвентаў. Недахопам яго работ, як і работ многіх іншых мастакоў, з'яўляецца налёт схематызма. Калі мастаку добра ўдаецца малюнак коней, дык у малюнку чалавечага тыпажу ёсць недахопы.

Работы Зальцмана — «На аэрадроме», Тычыны — «Паветраны дэсант», Бржэзоўскага — «Танкі» і інш. паказваюць, што ў совецкага народа ёсць каму і ёсць чым абараняць недатыкальнасць нашых граніц. Мастак Зальцман у сваёй карціне выяўляе незвычайныя здольнасці жывапісца ў кампазіцыі, колеры і рысунку.

Невялікага памеру работы Дучыца напісаны даўно, але яны цікавыя і займальныя. Па майстэрству і тэхніцы пісьма яны—пройдзены творчы этап, бо мастак на апошняй выстаўцы быў прадстаўлены работамі больш высокай якасці, чым гэтыя.

Карціна «Чапаеў» мастака Заборава цікавая па кампазіцыі і колеру, але слабавата ў малюнку.

Скульптары Бразэр і Азгур выставілі скульптурныя партрэты правадыроў партыі і ўрада. Іх тэматыка — момант сур'ёзнай перабудовы ўсяго іх творчага шляху. Да 1937 года гэтыя мастакі былі ў глыбокім палітычна-творчым прарыве. Гэтыя скульптары пры жаданні могуць даць сур'ёзныя і высокамастацкія творы.

Барэльеф Бембеля нядрэнна скампанаван, характары фігур чотка выяўлены. Работа глядзіцца добра.

Малады скульптар Глебаў прадстаўлен работамі «Варашылаў на кані» і «Лявоніха». Абедзве гэтыя работы прыкоўваюць да сябе ўвагу наведвальнікаў. Апошняя скульптурная група вылеплена з густам і вялікай любоўю. Яна ўся новая па кампазіцыйнай пабудове і па перадачы руху. Жаночая фігура вылеплена ў цёплых лініях, аддзелана да дэталей. Некалькі слабей і грубей вылеплена фігура чырвонаармейца. Але ў агульнай складанасці гэтая скульптурная група бясспрэчна выяўляе таленавітасць свайго аўтара.

Выстаўка да 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота не з'яўляецца справаздачай аб праробленай мастакамі БССР рабоце ў галіне абароннай тэматыкі за дваццаць год. Выстаўленыя работы — прадукт творчасці мінулага і гэтага года. Работы мінулых год знаходзяцца ў музеях, чырвонаармейскіх часцях, клубах, установах і г. д.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, аргкамітэт Саюза совецкіх мастакоў і самі мастакі павінны зрабіць для сябе з гэтай выстаўкі сур'ёзны вывад. Трэба выправіць тыя сур'ёзныя недахопы, якія выявіла выстаўка. А недахопы гэтыя наступныя: поўная адсутнасць работ на тэматыку ваенна-марскога флота і пагранічную. Адсутнасць паказу чырвонаармейцаў-пагранічнікаў недаравальна і нічым не апраўдана. Тое, што БССР — фарпост вялікага Совецкага Саюза на рубяжы з капіталістычным светам, павінна было быць падкрэслена на выстаўцы. Слаба паказана Чырвоная Армія сёнешняга дня, яе баявая падрыхтоўка, палітыка-выхаваўчая вучоба, тэхнічная аснашчонасць. Не паказана, з якой вялікай любоўю і энергіяй партыйныя і непартыйныя большэвікі ў Чырвонай Арміі і Чырвоным Флоце авалодваюць тэхнікай, каб паражаць ворага, які папрабуе ступіць на нашу зямлю.

Гэтыя недахопы можна выправіць. Іх трэба выправіць да арганізацыі выстаўкі к 20-годдзю вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў. У гэтай справе патрэбна планавасць, а не самацёк.

Мы маем палітычны і творчы рост асноўных кадраў беларускіх мастакоў. Нашы мастакі з кожным годам усё больш і больш удасканальваюць кісць і стэку, авалодваюць метадам соцыялістычнага рэалізма, складанасцю кампазіцыі, рысункам. Гэта гаворыць аб тым, што яны могуць і павінны выканаць тыя задачы, якія ставіць партыя, урад і таварыш Сталін перад выяўленчым мастацтвам.

С. КАРАБАН.

ВЫХАВАНЫЯ КРАІНАЙ СОВЕТАЎ

Тав. **БРАВАРСКАЯ Зінаіда Іванаўна.** У 1937 годзе скончыла Маскоўскі тэатральны інстытут, дзе вучылася сцэнічнаму майстэрству ў народнага артыста Тарханава (Маскоўскі мастацкі тэатр). Тав. Браварская працуе ў Дзяржаўным дзіцячым тэатры, у якім яна з поспехам іграе ролю Тоні («Як гарталася сталь») і царэўны Лебедзь («Казка аб цары Салтане»).

Тав. Браварская выкладае дыкцыю ў Кансерваторыі.

Тав. **Эдзі АГНЯЦВЕТ** — маладая беларуская паэтэса.

У 1935 годзе выйшла яе першая кніжка вершаў «Маё пакаленне», прасякнутая радасцямі і шчаслівымі хваляваннямі совецкай моладзі. У гэтым, 1938 годзе выходзіць другая кніга Эдзі Агняцвет — «Вершы». У гэтую кнігу ўвойдзе і першая паэма Агняцвет «Фелікс Дзержынскі».

Зараз Эдзі Агняцвет працуе над цыклам абаронных песень.

Тав. ВАСІЛЬЕВА Зінаіда Анатольеўна — прыма-балерына Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета. З 1935 па 1937 год была салісткай Вялікага Акадэмічнага тэатра Саюза ССР. Зараз, апрача выканання класічных партый (Одэта-Одылія — «Лебядзінае возера», Сванільда—«Капелія» і інш.), працуе над вобразам Зоські ў першым беларускім балеце «Салавей» (муз. Крошнера).

Тав. Васільева ў якасці педагога выхоўвае маладых беларускіх танцоўшчыц.

СВАБОДУ Э. ТЭЛЬМАНУ!

3 сакавіка споўнілася пяць год з таго часу, як фашысцкія каты вырвалі з пролетарскіх радоў стойкага барацьбіта за мір і свабоду Эрнста Тэльмана.

Фашысцкія трусы і забойцы неўзабаве пасля ўстанаўлення сваёй дыктатуры схапілі і кінулі ў Моабіцкую турму вернага сына пролетарыята, правадыра комуністычнай партыі Германіі.

Пяць год фашысцкія турэмшчыкі няволяць Эрнста Тэльмана па берлінскіх турэмных засценках. Пяць год фашысты фабрыкуюць абвінавачанні супроць Тэльмана і ўсё-такі ніяк не асмеляцца перадаць справу публічнаму працэсу. Фашызм трусіць. Берлінскія грамілы не забылі свайго лейпцыгскага пройгрышу. Яны пасуюць перад словам адважнага рэволюцыйнага барацьбіта. Палітычны паядынак з Тэльманам для фашыстаў можа скончыцца вельмі нязручна. Тысячы і мільёны працоўных Германіі і ўсяго свету стануць на бок Тэльмана. Гэтага баіцца фашысцкі ўрад Германіі.

Фашызм як агню баіцца гласнасці, баіцца адкрытага працэса над перадавым чалавекам і цішком прадоўжвае ўтончаныя інквізітарскія катаванні над Тэльманам у падзямеллях.

Сын гамбургскага пролетарыя, Эрнст Тэльман з ранніх год уступіў на шлях непахіснай барацьбы з эксплаататарамі і соцыял-здраднікамі — лакеямі капіталістаў і памешчыкаў. Яшчэ задоўга да вайны ён узняў свой голас пратэсту супроць важакоў германскай соцыял-дэмакратыі. Імперыялістычная вайна і соцыялістычная рэволюцыя ў Расіі шмат чаму навучылі Тэльмана. Неўстрашымы, адданы да канца справе рабочага класа, справе комунізма Тэльман неўзабаве прыходзіць у рады комуністычнай партыі, узбройваецца тэорыяй Маркса—Энгельса—Леніна — Сталіна. Ён змагаецца з контррэволюцыйнымі трацкістамі, правымі і «левымі» здраднікамі і становіцца кіраўніком комуністычнай партыі Германіі і прызнаным правадыром германскага пролетарыята, беднейшых пластоў сялянства і працоўнай інтэлігенцыі. Лепшыя традыцыі германскага рабочага руху Тэльман звязаў з вучэннем Леніна—Сталіна.

Пяць год фашысцкія каты падвяргаюць незвычайным пакутам германскі народ. Пяць год у турмах Германіі пакутуюць, знясільваюцца прадстаўнікі рэволюцыйнага класа. Пяць год фашысты катуюць лепшага сына рабочага класа, стойкага барацьбіта Комуністычнага Інтэрнацыянала. Але ніякімі катаваннямі не ўдалося фашыстам зламаць упартасці, самаадданасці барацьбіта за справу міру і за соцыялізм.

Імя Эрнста Тэльмана стала сімвалам барацьбы з фашызмам.

Вырваць з рук катаў палітычных зняволеных, вырваць з мерзкіх лап катаў Тэльмана — справа гонару сусветнага пролетарыята, справа гонару кожнага сумленнага чалавека ва ўсім свеце.

Свабодныя народы Совецкага Саюза разам з прыгнечанымі народамі ўсяго свету мацней чым калі-небудзь узнімаюць свой голас і гавораць:

— Свабоду Эрнсту Тэльману!

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

Дзённік ранішняга пасяджэння 2 сакавіка

2 сакавіка, у 12 гадзін дня, у Маскве, у Кастрычніцкай зале Дома Саюзаў, Ваенная калегія Вярхоўнага суда Саюза ССР у адкрытым судовым пасяджэнні прыступіла да разгляду справы Бухарына, Рыкава, Ягоды, Крэсцінскага, Ракоўскага, Розенгольца, Іванова, Чэрнова, Грынько, Зеленскага, Бессонава, Ікрамава, Хаджаева, Шаранговіча, Зубарэва, Буланава, Левіна, Плетнёва, Казакова, Максімава-Дзікоўскага, Кручкова, абвінавачваемых у здрадзе радзіме, шпіянажы, дыверсіях, тэроры, шкодніцтве, падрыве ваеннай магутнасці СССР, правакацыі ваеннага нападу замежных дзяржаў на Совецкі Саюз і ставіўшых сваёй задачай нізвяржэнне ў СССР існуючага соцыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу і аднаўленне капіталізма, аднаўленне ўлады буржуазіі, г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58—1А, 58—2, 58—7, 58—8, 58—9 і 58—11 Крымінальнага кодэкса РСФСР, а абвінавачваемых Іванова, Зеленскага і Зубарэва, апрача таго, у злачынствах, прадугледжаных арт. 58—13 КК РСФСР.

Склад суда: старшынствуючы — старшыня Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза ССР армваенюрыст В. В. Ульрых, члены суда: намеснік старшыні Ваеннай калегіі корваенюрыст І. О. Матулевіч, дыўваенюрыст Б. І. Іеўлеў і запасны член суда — брыгваенюрыст І. М. Зыранаў.

Абвінавачанне падтрымлівае пракурор Саюза ССР А. Я. Вышынскі.

Старшынствуючы тав. Ульрых, адкрыўшы судовае пасяджэнне, апытвае падсудных, ці атрымалі яны абвінаваўчае заключэнне. Усе падсудныя адказваюць станоўча. Затым тав. Ульрых паведамляе, што абаронцам падсуднага Левіна дапушчан па хадайніцтву самога падсуднага член маскоўскай калегіі абаронцаў Браўдэ І. Д., абаронцам падсудных Плетнёва і Казакова па іх хадайніцтву дапушчан член маскоўскай калегіі абаронцаў Камодаў Н. В., а астатнія падсудныя—Бухарын, Рыкаў, Ягода, Крэсцінскі, Ракоўскі, Розенгольц, Іваноў, Чэрноў, Грынько, Зеленскі, Бессонаў, Ікрамаў, Хаджаеў, Шаранговіч, Зубарэў, Буланаў, Максімаў-Дзікоўскі, Кручкоў — ад абаронцаў адмовіліся. Старшынствуючы дапытвае ўсіх гэтых падсудных, ці не змянілі яны сваё рашэнне і ці не жадаюць мець абаронцаў. Падсудныя пацвярджаюць, што яны адмаўляюцца ад абаронцаў.

Старшынствуючы тав. Ульрых растлумачвае падсудным, якія адмовіліся ад абаронцаў, што яны маюць права на абарончыя прамовы, незалежна ад сваіх апошніх слоў. Тав. Ульрых растлумачвае далей, што ўсе падсудныя маюць права задаваць пытанні адзін другому, даваць растлумачэнні па асобных момантах судовага следства.

Пасля зачытання абвінаваўчага заключэння сакратаром суда ваенюрыстам 1-га ранга А. А. Батнерам, старшынствуючы тав. Ульрых дапытвае кожнага ў паасобку падсуднага, ці прызнае ён сябе вінаватым ў прад'яўленых яму абвінавачаннях.

Усе падсудныя, за выключэннем падсуднага Крэсцінскага, поўнасцю прызнаюць сябе вінаватымі ў прад'яўленых ім абвінавачаннях.

Пасля перапынку суд прыступіў да допыту абвінавачваемых. Першым дапытваецца падсудны Бессонаў.

Па скончэнні допыту падсуднага Бессонава абвяшчаецца перапынак.

***

У Кастрычніцкай зале, дзе праходзіць працэс антысовецкага «права-трацкісцкага блока», прысутнічаюць рабочыя заводаў і фабрык сталіцы, прадстаўнікі совецкай грамадскасці, Чырвонай Арміі. Шырока прадстаўлена совецкая і замежная прэса. Прысутнічаюць члены дыпламатычнага корпуса.

Дзённік вячэрняга пасяджэння 2 сакавіка

Вячэрняе пасяджэнне Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР 2 сакавіка пачынаецца з допыту падсуднага Грынько, аднаго з відных удзельнікаў «права-трацкісцкага блока», агента фашысцкай разведкі, шкодніка ў галіне фінансаў Совецкага Саюза.

Поўнасцю пацвярджаючы свае паказанні, дадзеныя ім на папярэднім следстве, Грынько прызнае, што ён зрабіў рад найцяжэйшых злачынстваў супроць СССР.

Грынько прызнае, што ён на працягу раду год вёў затоеную актыўную барацьбу супроць совецкай улады, разам з Шумскім і іншымі прымаў удзел у арганізацыі паўстанцкіх атрадаў, а таксама ў перакідцы на тэрыторыю Совецкай краіны дыверсантаў, петлюраўскіх эмісараў і зброі для іх. І пасля таго, як нацыяналістычная арганізацыя была выкрыта, Грынько не спыняў сваёй здрадніцкай работы. Ен звязаўся з варожай разведкай. Як паказвае Грынько, у 1935 годзе ён уступіў па прапанове Любчэнка ў стварыўшуюся раней на Украіне нацыянал-фашысцкую арганізацыю.

Украінскія нацыянал-фашысты паставілі сваёй задачай арганізацыю ўзброенай інтэрвенцыі фашысцкіх дзяржаў супроць Совецкага Саюза. У гэтых мэтах украінскія нацыянал-фашысты звязаліся з «права-трацкісцкім блокам», з ваеннымі змоўшчыкамі Тухачэўскім і іншымі. У гэты-ж час Грынько ўстанаўляе сувязь, па яго выразу, з «уплывовымі коламі» адной з варожых Совецкаму Саюзу дзяржаў. Пасрэднікам з'яўляўся Крэсцінскі.

Грынько быў звязан з віднейшымі заправіламі антысовецкага «права-трацкісцкага блока»—Гамарнікам, Рыкавым, Пятаковым. Галоўнай стаўкай блока, паказвае Грынько, была стаўка на інтэрвенцыю фашысцкіх агрэсараў.

Радам пытанняў дзяржаўны абвінаваўца тав. Вышынскі высвятляе тэрарыстычную дзейнасць «права-трацкісцкага блока». Гэта злачынная дзейнасць, па прызнанню Грынько, была адной з асноўных задач змоўніцкай арганізацыі, арудваўшай па дырэктыве ворага народа Троцкага.

— Намячалася ўбраць Ежова, — паказвае Грынько.

— Што значыць убраць? — пытаецца дзяржаўны абвінаваўца.

— Убраць, гэта значыць забіць, — адказвае Грынько.

І далей ён расказвае суду аб тым, якіх выканаўцаў «права-трацкісцкі блок» падбіраў для гэтай страшэннай справы.

Грынько далей паказвае, як ён па заданню «права-трацкісцкага блока» ажыццяўляў шкодніцтва ў галіне фінансавай гаспадаркі і таваразвароту. Скажэнне падатковай палітыкі, накіраванне яе супроць інтарэсаў працоўных, паслабленне фінансавага кантролю, падрыў капітальнага будаўніцтва, няправільнае фінансіраванне сельскай гаспадаркі, няправільнае планаванне таваразвароту, здзекі з насельніцтва—гэткая злачынная работа, якая ажыццяўлялася гэтымі прэзрэннымі ворагамі народа.

***

У 8 гадзін 30 мінут вечара пачынаецца допыт падсуднага Чэрнова. У мінулым меншавік, Чэрноў уступіў у камуністычную партыю, як ён сам заяўляе, фармальна. Чэрноў прызнае, што ён вёў актыўную барацьбу з партыяй і совецкай уладай. У 1928 годзе ён уступіў у контррэволюцыйную арганізацыю правых, атрымліваючы ад Рыкава ўказанні, як яму дзейнічаць, каб азлабляць серадняка супроць совецкай улады, сеяць незадаволенне сярод сялян.

У 1928 годзе, калі падсудны Чэрноў сабраўся выехаць за-граніцу на лячэнне, Рыкаў даў яму заданне звязацца ў Берліне з Данам, прасіць апошняга ўзняць грамадскую думку капіталістычных краін супроць Совецкага Саюза, дабіцца праз лідэраў II інтэрнацыянала ўзмацнення варожых адносін да Совецкага Саюза, заручыцца іх падтрыманнем на выпадак захопу ўлады ў краіне «права-трацкісцкім блокам». У гэтай гутарцы Рыкава з Чэрновым прымаў удзел Томскі. І Рыкаў і Томскі патрабавалі ад Чэрнова, каб Чэрноў прама заявіў Дану, што калі «права-трацкісцкі блок» прыдзе да ўлады, то ён пойдзе не толькі на пагадненне эканамічнага парадку з буржуазнымі краінамі, але і на тэрытарыяльныя ўступкі. Рыкаў даручае Чэрнову даць у буржуазны друк тэндэнцыйнае паведамленне, рысуючае ў скажоным выглядзе совецкую сапраўднасць.

Вышынскі (Рыкаву). Вы далі даручэнне Чэрнову звязацца ў Берліне з Данам?

Рыкаў. Так.

І далей у адказ на пытанні пракурора тав. Вышынскага падсудны Рыкаў паведамляе, што ён сістэматычна снабжаў меншавіцкі «Социалистический вестник» матэрыяламі, накіраванымі супроць Совецкага Саюза.

Чэрноў далей гаворыць аб тым, што выканаў даручэнне Рыкава і ўступіў у перамаўленні з Данам.

Вышынскі. Абвінавачваемы Рыкаў, Чэрноў перадаваў вам, што ён выканаў ваша даручэнне?

Рыкаў. Пацвярджаю. Чэрноў даручэнне выканаў.

З паказання падсуднага Чэрнова далей высвятляецца, што ў часе прабывання Чэрнова ў Берліне ён быў завербаван нямецкай разведкай. Чэрноў вяртаецца ў Совецкі Саюз шпіёнам з клічкай «Рэйнольд».

Праз некаторы час у Маскву да Чэрнова з'явіўся нямецкі журналіст Паульь Шэфэр і патрабаваў ад яго шпіёнскія весткі аб запасах прамысловых тавараў, аб ходзе хлебазагатовак і г. д. Шпіён Чэрноў усе гэтыя весткі перадаў нямецкай разведцы.

З далейшых паказанняў Чэрнова відаць, што ён па заданню нямецкай разведкі і «права-трацкісцкага блока» гнаіў і заражаў хлеб. Чэрноў паказвае на судзе, як ён арганізоўваў свае злачынныя дзеянні ў сельскай гаспадарцы, як па яго заданню прышчаплівалі чуму жывёле, выразвалі племянных вытворнікаў. Па заданнях абвінавачваемага Чэрнова было загублена некалькі дзесяткаў тысяч свіней.

Вышынскі. А ці не прыпомніце вы, колькі за гэта атрымалі ад нямецкай разведкі?

Чэрноў. Каля 30 тысяч нямецкіх марак і 150 тысяч совецкімі рублямі.

Як паказвае Чэрноў, Рыкаў пры кожнай сустрэчы з ім патрабаваў узмацнення дыверсійнай і шкодніцкай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы.

Вышынскі (Рыкаву). Ці згодны вы з ацэнкай вашай сувязі з Чэрновым, дадзенай абвінавачваемым Чэрновым?

Рыкаў. Так, тое, што гаворыць Чэрноў, супадае з тымі ўстаноўкамі, якія я яму даваў.

Вышынскі (Чэрнову). Такіх, як Рыкаў, у вас было шмат кіраўнікоў?

Чэрноў. Апрача Рыкава і нямецкай разведкі — нікога.

Пасля допыту абвінавачваемага Чэрнова вячэрняе пасяджэнне закрываецца.

Дзённік ранішняга пасяджэння 3 сакавіка

На ранішнім пасяджэнні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР 3 сакавіка першым дапытваецца падсудны Іваноў. Вопытны правакатар царскай ахранкі, потым шпіён англійскай разведкі, Іваноў прызнае, што быў адным з актыўных удзельнікаў падпольнага антысовецкага «права-трацкісцкага блока». Іваноў паказвае, што ён яшчэ ў 1911 годзе стаў платным агентам жандарскага ўпраўлення ў Туле, «выхоўваўся» пад кіраўніцтвам ротмістра Матказіна. Спачатку ў Туле, а затым у Маскве, будучы студэнтам універсітэта, Іваноў даносіў ахранцы на асобных таварышаў, якія вялі рэволюцыйную работу, выдаваў студэнцкія забастоўкі, інфармаваў жандарскае ўпраўленне аб рэволюцыйным руху ў студэнцкіх арганізацыях.

Так пачалася «палітычная дзейнасць» падсуднага Іванова.

Пракурор тав. Вышынскі ставіць падсуднаму рад пытанняў аб тым, якім чынам пралез ён у большэвіцкую партыю. Іваноў прызнае, што ён гэта зрабіў па даручэнню жандарскага палкоўніка Колакалава, у 1915 годзе.

Вышынскі. Значыць, вы ўступілі ў партыю па ўказанню палкоўніка маскоўскай ахранкі Колакалава?

Іваноў. Так.

Вышынскі. З правакатарскімі мэтамі?

Іваноў. Так, з правакатарскімі мэтамі.

З далейшага допыту высвятляецца, што пасля рэволюцыі Іваноў рабіў усё для таго, каб знайсці варожыя сілы для барацьбы з совецкай уладай. Па ўласнаму свайму выразу, Іваноў, як воран, які ляціць на пах падалі, далучаўся да ўсякіх варожых груп.

Іваноў паказвае далей, як ён у пачатку 1918 года, звязаўшыся з Бухарыным, вёў падрыўную работу супроць партыі, як «левыя» комуністы замышлялі забойства Леніна, як яго сувязь з Бухарыным прадоўжвала ўмацоўвацца з кожным годам. У 1928 годзе, калі Іваноў працаваў на Паўночным Каўказе, Бухарын даў яму дырэктыву — арганізаваць там падпольную групу правых, ператварыць Паўночны Каўказ у рускую Вандэю, выклікаць там кулацкае паўстанне. Група правых, як паказвае Іваноў, была створана. Ен звязаўся з варожымі элементамі і рабіў усё для таго, каб забяспечыць кулацкае паўстанне.

Але калі план кулацкага паўстання праваліўся і Іваноў пераехаў у Паўночны край, Бухарын, паводле слоў Іванова, дае новую ўстаноўку — рыхтаваць паражэнне совецкай улады на выпадак нападу інтэрвентаў, разгарнуць дыверсійную і шкодніцкую работу, арганізаваць тэрарыстычныя групы і, нарэшце, ажыццяўляць шпіянаж на карысць замежнай дзяржавы. Іваноў пацвярджае, што Бухарын даў яму настаўленні аб тым, як абслугоўваць англійскую разведку.

Вышынскі. А вы выконвалі гэтыя настаўленні?

Іваноў. Выконваў, абслугоўваў, накіроўваў матэрыял, атрымліваў указанні праз рэзідэнта. Прычым, гэтыя ўказанні, атрымліваемыя ад англійскай разведкі, цалкам супадалі з тымі дырэктывамі, якія я атрымліваў ад цэнтра правых.

Вышынскі. Цалкам супадалі? Так што вы часам не адрознівалі, дзе дзейнічае цэнтр правых, а дзе — замежная разведка?

Іваноў. Так, тут было поўнае супаданне.

Іваноў расказвае суду, што Бухарын «намячаў» у будучым здачу лесапільных заводаў у канцэсію англічанам, а новыя лесапільныя заводы, пабудаваныя совецкай уладаю, «намячаў» аддаць у лік пагашэння царскіх даўгоў. Гэта былі планы на будучае. Але ў парадку «авансу» прадажнікі і здраднікі з «права-трацкісцкага блока» прадавалі англійскай буржуазіі найбольш высокаякасны лес па зніжаных цэнах.

Вышынскі. Выхаванне ў вас зусім акрэсленае. Пачалі вы сваё палітычнае выхаванне пад кіраўніцтвам ротмістра тульскай ахранкі Маматказіна, а закончылі — пад кіраўніцтвам Бухарына і Рыкава. Так я вас разумею?

Іваноў. Правільна...

Затым падсудны, адказваючы на пытанні тав. Вышынскага, дае падрабязныя паказанні аб тэрарыстычных замыслах «права-трацкісцкага блока», аб шкодніцтве ў лясной прамысловасці.

***

Пасля перапынку падсудны Бухарын, адказваючы на пытанні дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Вышынскага, пацвярджае, што ў 1928 годзе ён даваў указанні Іванову стварыць на Паўночным Каўказе антысовецкую падпольную арганізацыю правых. Бухарын прызнае, што ён ужо тады паведаміў Іванову аб існаванні контррэволюцыйнага правага цэнтра.

Падсудны Бухарын пацвярджае таксама, што ён ведаў аб перамаўленнях Іванова з прадстаўнікамі капіталістычных краін і што сам уводзіў Іванова ў планы контррэволюцыйнага правага цэнтра «адносна таго, што ў барацьбе супроць совецкай улады трэба выкарыстаць ваенную кан'юнктуру».

Вышынскі. Інакш кажучы, арыентацыя на дапамогу некаторых замежных дзяржаў?

Бухарын. Але, можна і так сказаць.

Вышынскі. Інакш кажучы, арыентацыя на паражэнне СССР?

Бухарын. Увогуле, сумарна, паўтараю — так.

Затым пачынаецца допыт падсуднага Зубарэва, аднаго з актыўных удзельнікаў «права-трацкісцкага блока», агента царскай ахранкі, фашысцкага шпіёна. Зубарэў поўнасцю пацвярджае свае паказанні, дадзеныя ім на папярэднім следстве.

У контррэволюцыйную арганізацыю правых Зубарэва завербаваў у 1929 годзе адзін з верхаводаў правых Смірноў. Хутка Зубарэў устанавіў сувязь з Рыкавым. У маі 1930 года Рыкаў прыязджаў у Свярдлоўск на абласную партыйную канферэнцыю. У часе канферэнцыі Рыкаў сустрэўся з агентам царскай ахранкі Зубарэвым і паведаміў апошняга, што са слоў Смірнова ведае яго як актыўнага ўдзельніка антысовецкай арганізацыі правых і што хацеў-бы «мець гутарку». Гутарка адбылася. Рыкаў атрымаў ад Зубарэва поўную інфармацыю аб стане контррэволюцыйнай правай арганізацыі на Урале і аб яе шкодніцкай, антысовецкай рабоце. Ен ухваліў падрыўную, подлую дзейнасць правых у Уральскай вобласці і даў указанне пашырыць яе, у прыватнасці арганізаваць сабатаж калектывізацыі, зрываць пасеўную кампанію ў калгасах, дэзарганізаваць таваразварот, а таксама аб'яднацца для контррэволюцыйнай работы з трацкістамі, зіноўеўцамі, эсэрамі, з усімі варожа настроенымі да совецкай улады элементамі.

Падсудны Рыкаў на пытанне пракурора тав. Вышынскага поўнасцю пацвярджае паказанні Зубарэва.

Далей Зубарэў расказвае аб сваёй шкодніцкай, дыверсійнай рабоце на Урале, а потым у Наркамземе СССР і РСФСР. Адначасова ён з'яўляўся шпіёнам фашысцкай разведкі адной з замежных дзяржаў і перыядычна даваў туды сакрэтныя весткі. У Наркамземе Зубарэў арганізоўваў тэрарыстычныя групы і сам з'яўляўся іх актыўным удзельнікам.

Вышынскі. Супроць каго вы намерваліся зрабіць злачынныя тэрарыстычныя акты?

Зубарэў. Спачатку мы канкрэтна нікога персанальна не мелі на ўвазе, а наогул намячалі тэрарыстычныя акты супроць кіруючага складу Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), у прыватнасці супроць членаў Палітбюро. У сілу свайго становішча, у сілу сваіх сувязей і вялікіх магчымасцей у сэнсе арганізацыі тэрарыстычнага акту мы спыніліся на Молатаве...

Вышынскі. На Молатаве — старшыні Совета Народных Камісараў СССР?

Зубарэў. Так, на Молатаве...

Адказваючы на пытанні тав. Вышынскага, Зубарэў далей прызнае сваю правакатарскую дзейнасць як агента царскай паліцыі. Завербаваў яго ў ахранку ў 1908 годзе прыстаў горада Кадельніч Васільеў. З таго часу Зубарэў, пераязджаючы з аднаго месца на другое, кожны раз пад іншай клічкай — «Васілій», «Палін», «Прохар», выдаваў паліцыі рэволюцыянераў.

Па просьбе дзяржаўнага абвінаваўцы тав. Вышынскага суд дапытаў у якасці сведкі былога паліцэйскага прыстава Васільева. Васільеў расказаў, як ён завербаваў Зубарэва ў лік агентаў царскай ахранкі, і што тут «цяжкасцей» ён ніякіх не сустракаў. Больш таго, сам Зубарэў прыдумаў для сябе клічку «Васілій». Два разы Васільеў перадаваў Зубарэву па 30 рублёў за правакатарскую работу.

Пасля допыту абвінавачваемага Зубарэва дзённае пасяджэнне закрываецца.

Дзённік вячэрняга пасяджэння 3 сакавіка

Пасля перапынку пракурор тав. Вышынскі дапытвае падсуднага Ракоўскага аб трацкісцкай дзейнасці падсуднага Крэсцінскага.

Гаворачы аб паказаннях Крэсцінскага, зробленых напярэдадні, Ракоўскі называе іх «неадпавядаючымі сапраўднасці». Ен заяўляе, што Крэсцінскі быў і астаўся актыўным трацкістам. Ракоўскі спыняецца на пісьме, адпраўленым Крэсцінскім у 1927 годзе Троцкаму. Напярэдадні Крэсцінскі спасылаўся на тое, што пры вобыску ў яго была знойдзена копія гэтага пісьма, у якім ён заяўляў аб сваім адыходзе ад трацкізма. Паказаннямі Ракоўскага ўстанаўляецца, што гутарка ідзе аб пісьме, апублікаваным у совецкім друку. Ракоўскі заяўляе, што гэта пісьмо было двурушніцкім. Гутарачы з Троцкім зараз-жа пасля апублікавання гэтага пісьма, Ракоўскі сказаў яму, што пісьмо прызначана выключна для таго, каб служыць у якасці «алібі». Ракоўскі гаворыць аб сваіх гутарках з Крэсцінскім у 1927 годзе, у прыватнасці, аб гутарцы, якая адбылася ў Берліне пры ўдзеле Каменева, і адзначае, што ў момант складання гэтага пісьма Крэсцінскі на справе аставаўся трацкістам. Крэсцінскі аставаўся трацкістам і пасля 1927 года; у пацвярджэнне гэтага Ракоўскі ўказвае на асабістае пісьмо, атрыманае ім ад Крэсцінскага ў 1929 годзе.

Апытваючы Крэсцінскага па сутнасці паказанняў Ракоўскага, пракурор прад'яўляе яму рэчавыя доказы: копію пісьма Крэсцінскага да Троцкага ад 27 лістапада 1927 года, тэкст пісьма Крэсцінскага ў рэдакцыю газеты «Экономическая жизнь» ад 22 сакавіка 1928 года. Крэсцінскі вымушан прызнаць сапраўднасць прад'яўленых яму дакументаў, а таксама правільнасць паказанняў падсуднага Ракоўскага.

— Калі гэта правільна, — гаворыць тав. Вышынскі, — ці прадаўжаеце вы ашукваць суд і адмаўляць правільнасць даных вамі на папярэднім следстве паказанняў?

Крэсцінскі заяўляе, што цяпер ён пацвярджае свае паказанні на папярэднім следстве.

Вышынскі. Што азначае ў такім выпадку ваша ўчарашняя заява, якую нельга інакш расцэньваць, як трацкісцкую правакацыю на працэсе?

Крэсцінскі. Учора, пад уплывам мінутнага вострага пачуцця ілжывага сораму, выкліканага абстаноўкай лавы падсудных і цяжкім уражаннем ад агалошваемага абвінаваўчага акта, паглыбленым маім хваравітым становішчам, я не ў стане быў сказаць праўду, не ў стане быў сказаць, што я віноўны. І замест таго, каб сказаць — так, я віноўны, я амаль машынальна адказаў — не, не віноўны.

Вышынскі. Машынальна?

Крэсцінскі. Я не ў сілах быў перад тварам сусветнай грамадскай думкі сказаць праўду, што я вёў увесь час трацкісцкую барацьбу.

Я прашу суд зафіксіраваць маю заяву, што я цалкам і поўнасцю прызнаю сябе віноўным па ўсіх абвінавачваннях, прад'яўленых асабіста мне.

Суд пераходзіць да допыту падсуднага Рыкава.

Рыкаў пачынае паказанні аб сваёй падрыўной падпольнай дзейнасці з 1928 года. Ен гаворыць, што па яго дырэктывах рад правых законспіраваў тады сваю прыналежнасць да правай апазіцыі. Адным з гэтай групы быў Ягода, які з'яўляўся тады намеснікам Старшыні АДПУ.

— Ці было ў вас з Ягодай пагадненне аб тым, што ён будзе аберагаць вашы кадры? — пытае тав. Вышынскі.

Рыкаў адказвае на гэта пытанне сцвярджальна. Падсудны Ягода, апытаны пракурорам, таксама пацвярджае гэты факт прамой здрады.

Рыкаў паказвае, што ў контррэволюцыйнай арганізацыі правых быў свой цэнтр у асобе Рыкава, Бухарына, Томскага. Гэты цэнтр даваў указанні аб арганізацыі кулацкіх паўстанцкіх выступленняў, у прыватнасці на Паўночным Каўказе і ў Сібіры. Для арганізацыі такіх выступленняў на Паўночны Каўказ быў спецыяльна камандзіраван адзін з бліжэйшых саўдзельнікаў Бухарына Слепкоў. На пытанне Дзяржаўнага абвінаваўцы Бухарын пацвярджае, што ён даваў дырэктывы аб арганізацыі кулацкіх паўстанняў.

Далей Рыкаў паказвае аб злачынствах контррэволюцыйнай арганізацыі правых па частцы тэрора. Цэнтр правых даваў дырэктывы аб тэроры, ствараў тэрарыстычныя арганізацыі. Рыкаў асабіста наладжваў слежку за ўрадавымі машынамі. Правыя праз Бухарына і эсэра Семёнава прыцягнулі да арганізацыі тэрарыстычных актаў эсэраўскую тэрарыстычную групу. З адабрэння цэнтра правых Семёнаў рыхтаваў замах на таварышаў Сталіна і Кагановіча. Гэта прызнае і апытаны пракурорам Бухарын.

***

Пасля перапынку прадаўжаецца допыт падсуднага Рыкава. Ен прызнае, што ў 1933—34 годзе контррэволюцыя імкнулася да аб'яднання сваіх сіл. Быў створан цэнтр з удзелам трацкістаў і зіноўеўцаў у складзе Каменева, Пятакова, Енукідзе, куды потым увайшлі Рыкаў, Бухарын, Томскі.

Рыкаў паказвае, што ў 1934 годзе абмяркоўвалася магчымасць скарыстання сіл контррэволюцыйнай арганізацыі ў сувязі з надыходзячым XVII партыйным з'ездам. Права-трацкісцкія бандыты абмяркоўвалі план арышту XVII з'езда. Змоўшчыкі разлічвалі, што адначасова з кіраўнікамі ўрада можна будзе падвергнуць арышту тых відных работнікаў рэспублік і абласцей, якія будуць супраціўляцца перавароту. Аднак гэты план сарваўся. Змоўшчыкі бачылі, што становішча ў краіне не дае ім надзеі на поспех, што згуртаванасць партыі, папулярнасць урада рабілі спробу перавароту зусім авантурыстычнай.

Тады правыя перайшлі да «новай арыентацыі». І тут, як паказвае Рыкаў, асноўнай стаўкай з'явілася стаўка на ваеннае паражэнне СССР. Цэнтр «права-трацкісцкага блока» ўстанавіў сувязь з нямецкімі фашыстамі праз Карахана, які паведаміў, што нямецкія фашысты адносяцца зусім прыхільна да магчымасці прыходу правых да ўлады, што яны згодны дапамагчы ім пры ўмове пэўных тэрытарыяльных уступак. Рыкаў заяўляе, што немцы настойвалі на расчляненні Совецкага Саюза, на адрыве ад СССР нацыянальных рэспублік.

Вышынскі. Вы ішлі да сваіх злачынных мэт цаной здрады?

Рыкаў. Зразумела.

Далей, адказваючы на пытанні пракурора СССР тав. Вышынскага, падсудны Рыкаў паказвае, што прадстаўляў сабой «права-трацкісцкі блок». У склад «блока» ўваходзілі трацкісты, правыя і зіноўеўцы, эсэры, меншавікі, буржуазна-нацыяналістычныя групы ў нацыянальных рэспубліках.

Потым тав. Вышынскі дэтальна высвятляе пытанне аб паражэнчай лініі «права-трацкісцкага блока». Па словах Рыкава, Бухарын фармуляваў гэту лінію так: адкрыццё фронта для інтэрвентаў. Бухарын прабуе гэта адмаўляць. Аднак у рэзультаце перакрыжаванага допыту вымушан сазнацца ў паражэнцтве.

Вышынскі (к Бухарыну). Вы стаялі, як і Рыкаў, на паражэнчай пазіцыі?

Бухарын. Не, але я адказваю за гэту справу.

Вышынскі. Што вы адказваеце, гэта справа іншая. Мне патрэбна ўстанавіць факт, ці быў у вас разгавор з Рыкавым і Томскім адносна адкрыцця фронта?

Бухарын. Быў, не з Рыкавым, а з Томскім.

Вышынскі. Аб чым?

Бухарын. Быў разгавор з Томскім, ён сказаў адносна ідэі адкрыцця фронта.

Вышынскі. Быў разгавор з Томскім аб адкрыцці фронта? Каму адкрыць фронт?

Бухарын. Супроць СССР...

Вышынскі. Каму адкрыць фронт?

Бухарын. Германіі...

Пасля раду пытанняў старшынствуючага тав. Ульрыха падсуднаму Рыкаву, абвяшчаецца перапынак да раніцы 4 сакавіка.

Дзённік ранішняга пасяджэння 4 сакавіка

З кожным днём працэс «права-трацкісцкага блока» ўсё больш і больш ускрывае страшэнныя злачынствы лютых ворагаў народа. Чорны спіс каварства, нізасці і подласці «права-трацкісцкага блока» дапоўнілі на ранішнім пасяджэнні Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда Саюза ССР 4 сакавіка падсудныя з буржуазна-нацыяналістычных груп, уваходзіўшых у «блок».

Паказанні аб сваёй здрадніцкай рабоце дае мацёры шпіён польскай ахранкі Шаранговіч. Яшчэ ў 1921 г. ён быў завербаван польскай разведкай у Варшаве і перакінут у СССР. Прабраўшыся на адказныя совецкія і партыйныя пасты ў Совецкай Беларусі, ён перадаваў польскай разведцы розныя сакрэтныя матэрыялы і выконваў яе заданні. У пачатку 1932 года Шаранговіч уступіў у беларускую нацыянал-фашысцкую арганізацыю, якой кіравалі Чарвякоў і Галадзед. Хутка, як прызнаецца падсудны, і ён сам стаў адным з кіраўнікоў гэтай арганізацыі. Як гэта пацвярджае падсудны, беларуская нацыянал-фашысцкая арганізацыя была звязана і працавала па заданнях польскай разведкі. З другога боку, яна была звязана з маскоўскім цэнтрам «права-трацкісцкага блока» і атрымлівала дырэктывы непасрэдна ад Рыкава і Бухарына. Шаранговіч прызнае, што нацыянал-фашысты ставілі сваёй задачай звяржэнне совецкай улады і аднаўленне капіталізма, паражэнне СССР у вайне з фашысцкімі дзяржавамі і адтаржэнне Беларусі ад Совецкага Саюза. Шаранговіч пацвярджае, што Бухарын і Рыкаў асабліва настойвалі на ўзмацненні сувязі з польскім генеральным штабам.

Нацыянал-фашысты ажыццяўлялі шкодніцтва ў розных галінах народнай гаспадаркі і культуры Беларусі, шпіёнілі, рабілі дыверсіі.

— У якіх мэтах? — звяртаецца да падсуднага Шаранговіча пракурор тав. Вышынскі.

Шаранговіч. У мэтах, вядома, і паражэнчых, у мэтах стварэння незадаволення насельніцтва, у мэтах...

Вышынскі. У мэтах правакацыйных?

Шаранговіч. Вядома.

Адказваючы далей на пытанні пракурора, падсудны Шаранговіч прызнае, што ён праводзіў вялікую разрушальную работу ў галіне сельскай гаспадаркі Беларусі. Імкнучыся выклікаць незадаволенне насельніцтва, шкоднікі стараліся тармазіць калгасны рух, падрывалі жывёлагадоўлю. Так, яны распаўсюджвалі чуму сярод свіней, губілі конскае пагалоўе. У рэзультаце дыверсій, прызнаецца падсудны, у 1936 годзе загінула каля 30 тысяч коней.

Шаранговіч паказвае далей, што нацыянал-фашысты праводзілі шкодніцтва і ў галіне прамысловасці, у прыватнасці разбуралі паліўную базу рэспублікі. Буйнае шкодніцтва ажыццяўлялася на культурным фронце.

Вышынскі. Такім чынам можна сказаць, што ні адна галіна соцыялістычнага будаўніцтва не аставалася па-за полем зроку, па-за вашай шкодніцкай дзейнасцю?

Шаранговіч: Зусім правільна.

З далейшага допыту падсуднага высвятляецца, што нацыянал-фашысты рыхтавалі тэрарыстычныя акты супроць тав. Варашылава і іншых кіраўнікоў ВКП(б) і совецкага ўрада.

Суд пераходзіць да допыту падсуднага Файзулы Хаджаева, аднаго з віднейшых буржуазных нацыяналістаў Узбекістана, праводзіўшага там на працягу многіх год антысовецкую работу. Хаджаеў прызнае, што гэту гнусную дзейнасць ён пачаў яшчэ з 1920 г., знаходзячыся на чале Бухарскай Народнай Рэспублікі. Пазней Хаджаеў звязаўся з буржуазна-нацыяналістычнай групай Ікрамава, а затым з «права-трацкісцкім блокам». У 1930 годзе ў Маскве Файзула Хаджаеў дагаварыўся з Рыкавым аб сумеснай здрадніцкай дзейнасці.

Хаджаеў паказвае суду, што Рыкаў прапанаваў разгарнуць шкодніцтва асабліва ў галіне сельскай гаспадаркі і патрабаваў развіцця антысовецкай дзейнасці ва ўсіх напрамках. Такія-ж дырэктывы перадаў праз Ікрамава Бухарын, які прыязджаў ва Узбекістан у 1933 годзе. У наступным годзе ва Узбекістан прыехаў Анціпаў і ад імя цэнтра правых прапанаваў актывізаваць дыверсійную і правакацыйную дзейнасць, узбуджаць незадаволенне мас совецкай уладай, разгарнуць фармаванне паўстанцкіх груп, стварыць тэрарыстычныя групы, звязацца з англійскімі разведчымі органамі.

У 1936 годзе ў Ташкент зноў прыехаў Бухарын. Ен астаўся незадаволеным «слабым развіццём» шкодніцкай і дыверсійнай работы і настойваў на ўзмацненні антысовецкай дзейнасці буржуазных нацыяналістаў. Бухарын гаварыў, што «права-трацкісцкі блок» звязан з Германіяй і Японіяй і што буржуазным нацыяналістам ва Узбекістане неабходна непасрэдна звязацца з Англіяй. Мы разумелі гэта, паказвае Хаджаеў, як курс на адрыў Узбекістана ад СССР, на ажыццяўленне англійскага пратэктарата над Узбекістанам, што азначае ператварэнне Узбекістана ў калонію.

На пытанне тав. Вышынскага аб тым, чым абгрунтоўваў Бухарын гэ-

(ПРАЦЯГ НА 3-й СТАР.).

ПРАЦЭС АНТЫСОВЕЦКАГА „ПРАВА-ТРАЦКІСЦКАГА БЛОКА“

Дзённік ранішняга пасяджэння 4 сакавіка

(ПРАЦЯГ)

ту сваю злачынную дырэктыву, падсудны Хаджаеў паказвае, што Бухарын усхваляў фашызм. Ён указваў, што гітлераўская Германія хоча стаць гегемонам Еўропы, што магчыма пагадненне Германіі і Японіі для сумеснай барацьбы з СССР. Задача правых, трацкістаў і нацыянал-фашыстаў, заяўляў Бухарын, заключаецца ў тым, каб дабіцца паражэння СССР шляхам узмацнення падрыўной работы.

Затым падсудны Хаджаеў пералічвае канкрэтныя факты шкодніцкай і дыверсійнай дзейнасці буржуазна-нацыяналістычнай арганізацыі ва Узбекістане. У сельскай гаспадарцы яна заблытала севазвароты, заблытала насенную справу, дабілася гібелі і разбазарвання вялікай колькасці жывёлы, шкодніцка затрымлівала развіццё шаўкаводства, драпежніцка вырубала тутавыя дрэвы, чым знішчалася кармавая база шаўкаводства. У галіне ірыгацыі былі падрыхтаваны дыверсійныя акты ў Самаркандзе і ў Фергане.

Пры арганізацыі паўстанцкіх груп для барацьбы з совецкай уладай буржуазна-нацыяналістычная арганізацыя звяртала асаблівую ўвагу на адраджэнне басмацтва. Праз басмацкіх атаманаў (курбашы) Хаджаеў стараўся ажыццявіць сувязі з англійскай разведкай. Адначасова пад кіраўніцтвам Ікрамава і Хаджаева ствараліся тэрарыстычныя групы.

Падсудны Хаджаеў прызнае сябе вінаватым у здрадзе радзіме, у здрадзе народу Узбекістана і народам усяго СССР, у дыверсійнай, шкодніцкай і тэрарыстычнай дзейнасці, накіраванай да звяржэння совецкай улады і рэстаўрацыі капіталізма.

Тав. Вышынскі пытаецца, што вядома падсуднаму Хаджаеву аб забойстве Абід-Саідава. Падсудны Хаджаеў адказвае, што гэта забойства зроблена па пастанове нацыяналістычнай арганізацыі Ікрамава.

Тав. Вышынскі звяртаецца да падсуднага Ікрамава.

Вышынскі. За што быў забіт Абід-Саідаў?

Ікрамаў. За тое, што выкрываў буржуазных нацыяналістаў.

Вышынскі. Ці быў у ліку забойц Абід-Саідава Бату?

Ікрамаў. Ён — удзельнік забойства.

Вышынскі. Значыць, Абід-Саідава забіў Бату — ваш чалавек?

Ікрамаў. Так.

На гэтым ранішняе пасяджэнне заканчваецца.

ВЫХАВАНЫЯ КРАІНАЙ СОВЕТАЎ

Тав. **СЕМЯНЮК Валенціна Сямёнаўна.** Скончыла студыю пры Белдзяржпрамтэатры ў 1937 годзе. У выпускным спектаклі «Слуга двух паноў» Гальдоні іграла ролю Беатрычэ. Семянюк у студыі вылучалася добрым поспехам у сцэнічнай вучобе.

Тав. **ФРЫДМАН Малка Айзікаўна** — артыстка Яўрэйскага тэатра БССР з 1929 года.

Тав. Фрыдман іграла багата адказных роляў у рэпертуары тэатра, сярод якіх вылучаюцца Фрумеле з «Рэкрута» Аксенфельда, Жанета («Жакерыя»). Зараз артыстка працуе над стварэннем вобраза Суламіфі (паводле Гольдфадэна). Тав. Фрыдман валодае добрым мецца-сапрана.

Тав. **КРОЗ Дора Захараўна**—салістка опернага тэатра. Скончыла беларускую Кансерваторыю ў 1937 годзе. З 1933 года працуе ў тэатры. Валодае чароўным лірычна-каларатурным сапрана. Яна з поспехам выканала партыі Джыльды ў «Рыгалета» і Розіны ў «Севільскім цырульніку».

СМЕРЦЬ ЗАБОЙЦАМ А. М. ГОРКАГА!

«... Ажыццявілі зладзейскае ўмярцвенне В. В. Куйбышэва, В. Р. Менжынскага і А. М. Горкага».

(З паведамлення Пракуратуры СССР).

Гэтакай подласці, гэтакай здрады
Свет і не чуў і не бачыў.
Смерць крывапійцам, раз'юшаным гадам,
Вынішчыць след іх сабачы!

Годы міналі, жылі яны годы, —
Іх за людзей палічылі, —
А яны, здрайцы вольных народаў,
Нож нам пад сэрца тачылі.

Мала падпалаў, ім трэба атруты,
Дай ім крыві па калены!

Смерць вам, жывыя нябожчыкі-трупы,
Смерць за пісьменніка-генія!

Спі, буравеснік, усмерчаны Горкі
Хэўрай прадажніцкіх юдаў.
Дум тваіх радасных ясныя зоркі
Векі свяціці нам будуць.

Мы, згартаваныя сталінскай воляй,
Смерцю сатром людаедаў,
Пойдзем, як йшлі мы, у сонечнай долі
Ленінска-сталінскім следам.

ЯНКА КУПАЛА.

Менск, 28.II. 1938.

Змесці з твару зямлі ворагаў народа!

Заслухаўшы паведамленне аб працэсе змоўніцкай групы «права-трацкісцкага блока», мы, работнікі Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета, з нянавісцю клеймім подлых здраднікаў і забойцаў. Гнусная трацкісцка-бухарынская зграя хацела прадаць фашызму соцыялістычную радзіму рабочых і сялян, якую рабочыя і сяляне пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна заваявалі сваімі намаганнямі і ўласнай крывёю.

Подлыя бандыты, вырадкі фашызма, каб падарваць адзінства нашай большэвіцкай партыі, падрыхтоўвалі зладзейскае забойства кіраўнікоў партыі і ўрада. Подлымі вырадкамі ўчынена зверскае забойства Сяргея Міронавіча Кірава, свядомае ўмярцвенне Аляксея Максімавіча Горкага, Валерыяна Куйбышэва і Менжынскага. Але ворагам народаў соцыялістычнай радзімы не ўдалося аслабіць адзінства партыі Леніна—Сталіна. Партыя яшчэ больш згуртавала свае рады вакол любімага правадыра таварыша Сталіна.

Мы, работнікі Белдзяржтэатра оперы і балета, просім Пракуратуру і Вярхоўны суд СССР змесці з твару зямлі ворагаў, якія мараць ажыццявіць рэстаўрацыю капіталізма ў нашай соцыялістычнай сталінскай радзіме.

Мы, работнікі Белдзяржтэатра оперы і балета, яшчэ больш узмоцнім рэволюцыйную пільнасць, згуртуемся вакол партыі Леніна—Сталіна.

Няхай жыве і мацнее караючы меч дыктатуры пролетарыята — органы дзяржаўнай безапаснасці і слаўны нарком Нікалай Іванавіч Ежоў!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна і вялікі правадыр усяго працоўнага чалавецтва — любімы Сталін!

ШАЛЁНЫХ САБАК— ДА РАССТРЭЛУ!

Нельга стрымаць гнеў і цяжка падабраць словы, каб выказаць усю нянавісць да фашысцкіх сабак, праклятых трацкісцка-бухарынскіх вырадкаў, выкрытых слаўнымі органамі чэкісцкай разведкі, органамі нашага НКВД.

Агідныя вужакі мецілі ў самае сэрца рэволюцыі. Яны забілі дарагога нам С. М. Кірава, яны ўмярцвілі вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага, крышталыга-чыстага большэвіка В. В. Куйбышэва, благароднага чэкіста В. Р. Менжынскага.

Але яны пралічыліся! Наш народ да канца сатрэ з зямлі подлых фашысцкіх сабак!

Яны хацелі адарваць Беларусь ад Совецкага Саюза. Але яны пралічыліся! Яны забыліся аб тым, што совецкі беларускі народ, які ў Вялікім Кастрычніку атрымаў права на свабоднае шчаслівае жыццё — ніколі гэтых праву не аддасць!

Точыць зубы хітры вораг
На жыццё, на нашу радасць.
Хай не думае і лезці
У наш совецкі агарод!
Да канца з зямлі змяцем мы
Падкалодных гэтых гадаў,
За радзіму грудзьмі стане
Беларускі наш народ!

Шалёныя сабакі ўмярцвілі геніяльнага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага, мы адкажам ім словамі Горкага:

«Калі вораг не здаецца — яго знішчаюць».

Шалёных трацкісцка-бухарынскіх сабак—да расстрэлу!

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

Віцебскае мастацкае вучылішча патрабуе дапамогі

Віцебскае мастацкае вучылішча — адзіны цэнтр выхавання мастацка-педагагічных кадраў у Беларусі. З сцен гэтага вучылішча вышла нямала таленавітых мастакоў.

Справа выхавання маладых кадраў цалкам ускладзена на плечы педагогаў і кіраўніцтва вучылішча. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР не цікавіцца пытаннямі метадычнага кіраўніцтва і не нясе адказнасці за выпускаемыя кадры мастакоў. Да гэтага часу Упраўленне абмяжоўвае сваё кіраўніцтва вучылішчам толькі фінансаваннем установы. Усесаюзны-ж Камітэт па справах мастацтваў абмяжоўваецца прысылкай праектаў праграм па спецыяльных дысцыплінах для далейшай іх распрацоўкі педагогамі-мастакамі на месцы.

Сярод педагогаў няма яшчэ адзінага погляду на метады выкладання. Некаторая розніца ў метадах—з'ява натуральная і дапушчальная, але адзіная падагагічная аснова, пераемнасць ад курса да курса, у школе павінна быць. На справе гэтага няма. Не існуе яшчэ і цэнтра, дзе-б педагогі маглі атрымаць метадычнае кіраўніцтва.

Акрамя ўсяго, вучылішчу нехапае чатырох педагогаў-мастакоў. Мастакі перагружаны, што зніжае якасць педагагічнай работы і пазбаўляе іх магчымасці весці самастойную творчую работу.

Справа, вядома, не ў тым, што педагог затрачвае на кожнага вучня большую ці меншую колькасць часу, а ў рэальным змесце работы. Педагогі-мастакі адарваны ад інтэнсіўнай творчай работы, трацяць сваю кваліфікацыю. Перад мастакамі стаіць задача навучыць кожнага студэнта грамаце выяўленчага мастацтва, выхаваць і развіць у кожным студэнце мастацка-творчыя сілы, мастацкі густ. Для гэтага патрэбна правільная пастаноўка навучання, цвёрдая педагагічная аснова і наяўнасць сістэмы ідэйна-палітычнага выхавання. Аднак, адзіная педагагічная аснова адсутнічае, мастакі-педагогі перагружаны і, акрамя ўсяго, няма выкладчыка ленінізма і гісторыі партыі. Гэтыя дысцыпліны павінны займаць вядучае становішча ў сістэме мастацкага выхавання і мець уплыў на работу вучашчыхся па выкананню імі сюжэтна-кампазіцыйных заданняў.

Пры аглядзе класных работ 4-га (выпускнога) курса высвятляецца, што граматай выяўленчага мастацтва авалодалі ў поўнай меры яшчэ не ўсе. Хатнія работы па стварэнню кампазіцый далі таксама не бліскучыя вынікі. Студэнты мала працуюць, мала практыкуюцца на даму. Педагогі-мастакі дапамагаюць ім парадай, кансультуюць. Але гэтага мала. Трэба ўзняць агульнае палітычнае выхаванне, разгарнуць пазашкольную работу з вучашчыміся.

Да гэтага часу вучылішча не мае сродкаў на арганізацыю скульптурнага гуртка, ніхто не падтрымлівае творчых запатрабаванняў моладзі.

Час пакончыць з гэтымі недахопамі, якія перашкаджаюць ідэйна-палітычнаму росту і акадэмічнай вывучцы будучых мастакоў-педагогаў. Час ужо ўсебакова забяспечыць якасны рост кадраў, выпускаемых Віцебскім мастацкім вучылішчам, каб яны былі здольны не толькі быць педагогамі ў сярэдняй школе, але і мелі магчымасць прадоўжваць вучобу ў мастацкіх інстытутах. Трэба рыхтаваць добрыя маладыя кадры беларускіх мастакоў.

У гэтым у першую чаргу павінна быць зацікаўлена не толькі кіраўніцтва вучылішча, а і Упраўленне па справах мастацтваў і Саюз совецкіх мастакоў БССР. Час ужо наладзіць творчую сувязь з вучылішчам і педагогамі-мастакамі, якія выхоўваюць новыя кадры мастакоў для БССР. Ад гэтага залежыць поспех далейшай работы вучылішча. Трэба стварыць адпаведныя матэрыяльныя ўмовы для творчай работы мастакоў-педагогаў. Гэта прыцягне ў вучылішча і новыя сілы.

А. РУЧ'ЕВА.

Выкладчык гісторыі мастацтваў Віцебскага мастацкага вучылішча.

АБ ВЫКЛАДАННІ ЛІТАРАТУРЫ Ў ШКОЛАХ БССР

«Выкладанне мастацкай літаратуры ў школе — надзвычай важная і адказная справа, — пісала «Правда» ў перадавым артыкуле 8 жніўня 1937 года. — Побач з матэматыкай і прыродазнаўствам вывучэнне роднай мовы і мастацкай літаратуры з'яўляецца фундаментам для ўсякай адукацыі і колькі-небудзь сур'ёзнай граматнасці наогул... Літаратура ў школе можа і павінна служыць магутным сродкам выхавання характараў падрастаючых пакаленняў, выхавання ў іх мастацкага густу, любві і адданасці да радзімы».

Аб гэтым указанні «Правды» надзвычай да месца напомніць цяпер настаўнікам літаратуры і мовы. У радзе школ БССР выпускаецца з-пад увагі велізарнае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне літаратуры, якой належыць буйнейшая роля ў фармаванні светапогляду совецкай дзетвары.

З дапамогай літаратуры мы павінны выхаваць пакаленне патрыётаў, якія любяць сваю соцыялістычную радзіму і яе слаўнае мінулае. Лепшыя творы класічнай і сучаснай літаратуры, уключаныя ў школьную праграму і кола пазакласнага чытання, укараняюць у свядомасць вучняў нянавісць да прыгнечання і эксплаатацыі, да пануючых класаў дарэволюцыйнай Расіі. Гэтыя-ж творы, пры адпаведным растлумачэнні іх выкладчыкамі, вучаць ненавідзець сучаснае фашысцкае варварства і мракабессе, сістэму капіталістычнага гвалту ў цэлым.

Разам з тым, вывучаючы літаратуру, дзеці пранікаюцца павагай і сімпатыяй да працоўнага народа, захапляюцца прыкладам жыцця і барацьбы лепшых людзей, барацьбітоў за соцыяльную справядлівасць і шчасце чалавецтва. Нямала вобразаў такіх герояў створана майстрамі мастацкага слова (Пушкін, Грыбаедаў, Чэрнышэўскі, Некрасаў, Горкі і г. д.).

Правадыры і настаўнікі рабочага класа ў сваіх працах і выступленнях выдатна выкарыстоўваюць літаратурную спадчыну класікаў, вобразы, створаныя буйнейшымі прадстаўнікамі рускай і сусветнай літаратуры. Агульнавядомы шматлікія прыклады спасылак на Гогаля, Шчэдрына, Чэхава і іншых пісьменнікаў у работах Леніна і Сталіна.

Прыгадаем хоць-бы гістарычны даклад таварыша Сталіна на надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Советаў аб праекце Канстытуцыі СССР, дзе бяздарная зарубежная фашысцкая прэса лёгка магла пазнаць самую сябе ў вобразе невука, самадура-бюракрата з шчэдрынскай казкі, які распарадзіўся «закрыць Амерыку». Так сама паказальна выкарыстанне таварышам Сталіным у сваёй прамове перад выбаршчыкамі Сталінскай выбарчай акругі г. Масквы вобраза «няпэўных людзей» з гогалеўскіх «Мёртвых душ», людзей, якія «ні тое, ні сёе, ні ў горадзе Багдан, ні ў сяле Селіфан».

Гэтыя выступленні нашых правадыроў красамоўна пацвярджаюць жывучасць у нашы дні многіх літаратурных тыпаў, створаных класікамі. Разам з тым гэтыя выказванні служаць класічным узорам таго, як належыць выкарыстоўваць літаратурны твор і рабіць яго актуальным, дзейсным, здольным выхоўваць масы ў духу большэвіцкай ідэйнасці.

Пашыраючы пазнавальны кругагляд вучняў, літаратура разам з тым прышчэплівае ім належныя эстэтычныя паняцці і густы, з'яўляючыся таксама важнейшым фактарам мастацкага выхавання.

Як-жа рэалізуюцца ў масавай школе гэтыя найбагацейшыя магчымасці выхаваўчага і адукацыйнага ўздзеяння, якія заключаюцца ў літаратуры? Знаёмства са школьнай практыкай пераконвае нас у тым, што ў радзе месц выкладанне літаратуры пастаўлена нездавальняюча і далёка не адпавядае прад'яўляемым патрабаванням.

Найбольш распаўсюджанымі недахопамі ўрокаў па літаратуры з'яўляюцца — дрэнная падрыхтоўка да іх, сухасць выкладання, няўменне выкарыстаць літаратурны твор у выхаваўчых мэтах, недастатковая ўвага да мастацкага боку вывучаемага тэкста, схільнасць да адцягненага соцыялагізавання, нязжытага ў радзе школ, адсутнасць увязкі і ўзгодненасці паміж выкладаннем блізкіх адна да адной дысцыплін — літаратуры і мовы.

Вось урок літаратуры, на прыкладзе якога рэльефна выступаюць некаторыя з указаных недахопаў (Навасёлкаўская НСШ, Пухавіцкага раёна). Праходзячы ў 6 класе апавяданне Я. Коласа «Выбар старшыні», якое рысуе камедыю «выбараў» валаснога начальства ў дарэволюцыйны час, настаўніца прыступіла да чытання гэтага апавядання без папярэдняй гутаркі-растлумачэння аб тым, у якую эпоху адбывалася гэта падзея, як жылі тады сяляне ў адрозненне ад цяперашніх калгаснікаў і г. д.

Настаўніца не супроцьпаставіла дарэволюцыйнай камедыі «выбараў», апісаных у апавяданні Коласа, нашу выбарчую сістэму, заснаваную на сапраўднай соцыялістычнай дэмакратыі, свабодзе і роўнасці ўсіх грамадзян СССР, словам, пакінула ў дзецях скажонае ўяўленне аб дарэволюцыйнай і сучаснай рэчаіснасці.

Гутарачы з дзецьмі на ўроках літаратуры, многія настаўнікі не звяртаюць належнай увагі на ідэйна-пазнавальны бок вывучаемага твора і добраякаснае яго асэнсаванне. Часта можна сустрэць недастатковую работу над мовай вывучаемых тэкстаў, адсутнасць тлумачэння слоў і ўвагі да мастацка-выяўленчых прыёмаў аўтара— кампазіцыя, эпітэты, метафары, параўнанні і г. д.

На ўроках літаратуры некаторыя настаўнікі выпускаюць з-пад увагі задачу барацьбы за культуру мовы, не выпраўляюць недакладных, малаграматных адказаў вучняў, звяртаючы ўвагу толькі на фармальнае знаёмства іх з зададзеным тэкстам. Не заўсёды таксама сочаць настаўнікі, асабліва ў сельскіх школах, за ўласнай мовай, дапускаючы неахайныя звароты і выразы, складзеныя з мешаніны рускіх і беларускіх слоў, накшталт наступных: «У час акупацыі палепшыць сваю **жизнь** мог селянін толькі з **аружыем** у руках»... (з гутаркі выкладчыка беларускай літаратуры аб аповесці «Дрыгва» ў Смалявіцкай школе).

Літаратурнае чытанне, якое часта практыкуецца на ўроках, мае сваёй мэтай навучанне дзяцей выразнаму, асэнсаванаму чытанню з захаваннем інтанацый, правільнага вымаўлення, пунктуацыйных правілаў, выразнасці мовы і г. д. Толькі такое літаратурнае чытанне будзе садзейнічаць свядомаму засваенню тэкста і мець эмацыянальны ўплыў на дзяцей, выклікаючы ў іх належныя адносіны да паказваемых падзей. Узоры такога бездакорнага чытання павінен даваць сам настаўнік і патрабаваць таго-ж ад вучняў.

На жаль, яшчэ не ўсе настаўнікі ўмеюць выхоўваць у вучняў любоў і павагу да класікаў мастацкага слова, лепшых майстраў рускай літаратуры (Пушкін, Грыбаедаў, Лермантаў, Гогаль, Остроўскі, Чэхаў і т. д.), імкненне іх паўней і глыбей пазнаёміцца з іхняй творчасцю. Сям-там на месцах урокі літаратуры па старой памяці ператвараюцца ў вульгарна-соцыялагічную «прапрацоўку» класіка, які маўляў, «хвараў на абмежаванасць», праяўляючы пры гэтым «дваранскія ці буржуазныя тэндэнцыі».

Так, на ўроку літаратуры ў 6 класе адной з школ Клічаўскага раёна настаўнік упарта трэціраваў Гогаля, як кансерватара, які сімпатызуе сваім «старасвецкім памешчыкам». Не пашанцавала ў асобных школах за «недахопы свайго светапогляду» таксама Ганчарову, Тургеневу і іншым.

Асобныя настаўнікі, недастаткова падрыхтаваныя, усё яшчэ не адмовіліся ад «лявацкага», антыленінскага, глыбока шкоднага пункту погляду на класікаў, што культываваўся ў свой час Пераверзевым, раппаўцамі і іншымі выкрытымі вульгарызатарамі ад крытыкі. Бясспрэчна, мы абавязаны ў даступнай для дзяцей форме (у старэйшых класах больш поўна) растлумачыць класавую сутнасць і ідэйную накіраванасць пісьменніка і асобных яго твораў. Недапушчальна, аднак, ахайваць вялікіх мастакоў мінулага, у тлумачэнні творчасці якіх трэба выходзіць перш за ўсё з каштоўных у ідэйна-пазнавальных адносінах, прагрэсіўных, дэмакратычных элементаў, уласцівых класікам. Гэты бок, г. зн., па вызначэнню Горкага, крытычны рэалізм з'яўляецца вядучым у творчай спадчыне Фанвізіна, Грыбаедава, Лермантава, Ганчарова, Тургенева, Остроўскага, Чэхава, Талстога, ужо не гаворачы аб найвялікшым народным паэту Пушкіне, а таксама аб пісьменніках рэволюцыйных дэмакратах — Герцэне, Чэрнышэўскім, Некрасаве, Шчэдрыне, Успенскім.

«Вялікія мастакі мінулага належаць працоўнаму народу, які атрымаў у спадчыну ўсе культурныя каштоўнасці папярэдніх класаў, і не ў нашых інтарэсах трымаць гэтыя каштоўнасці пад спудам, распыляць і ператвараць іх у гістарычную старызну, як прабуюць зрабіць вульгарныя соцыёлагі. Вялікія мастакі жывы для нас. Іх праца не прайшла дарэмна: лепшыя іх творы абуджалі розумы, дапамагалі народу рушыць уперад і тым самым знайсці шлях да вызвалення. Мастацкія творы класікаў... могуць дапамагчы нашай моладзі зразумець не толькі мінулае, але і сучаснае» («Правда», 8 чэрвеня 1936 г.).

Гэта ўказанне «Правды» вычэрпваючым чынам вызначае лінію выкладання літаратуры ў нашай школе.

Падкрэсліваючы з усёй катэгарычнасцю рашаючую ролю настаўніка ў засваенні дзецьмі ведаў, мы аднак не ўправе ігнараваць рад цяжкасцей, з якімі сустракаецца на практыцы выкладчык літаратуры ў масавай школе. Гутарка ідзе аб недахопе тэкстаў, вывучаемых твораў, аб адсутнасці добраякасных падручнікаў па рускай літаратуры, асабліва для 5—7 класаў, і метадычных дапаможнікаў, аб поўнай адсутнасці падручніка і крытычных матэрыялаў па беларускай літаратуры. Гэта, безумоўна, дае сябе адчуваць і мае адмоўны ўплыў на падрыхтоўку настаўніка і веды вучняў.

За апошнія годы ў БССР выдана нямалая колькасць мастацкай літаратуры на рускай мове. Звяртаюць, аднак, на сябе ўвагу па меншай меры дзіўныя адносіны Белдзяржвыдавецтва (сектара мастацкай літаратуры) да патрэб масавай школы, якая часта пазбаўлена неабходных ёй твораў.

У 7 класе вывучаюцца «Мертвые души» Гогаля, поўны тэкст якіх на месцах вельмі цяжка знайсці. Не лічачыся з гэтым, Белдзяржвыдавецтва чамусьці выдае замест «Мертвых душ» — «Вечера на хуторе близ Диканьки» таго-ж аўтара, якія адсутнічаюць у школьнай праграме.

З раманам «Господа Головлевы», уключаным у праграму, вучні сярэдняй школы вымушаны знаёміцца па мізэрных хрэстаматыйных урыўках, якія далёка не даюць цэльнага ўяўлення аб гэтым лепшым творы Шчэдрына. Выпускаючы з віду гэтую акалічнасць, Белдзяржвыдавецтва і тут не жадае ісці насустрач школе, выдаючы замест «Господ Головлевых» — «Пошехонскую старину» і «Историю одного города».

Падрыхтаванае да друку выданне рамана «Что делать» Чэрнышэўскага, які вельмі неабходны для школы, аказалася недапушчальна скажоным па віне рэдактароў Белдзяржвыдавецтва і да гэтага часу не ўбачыла свету.

Год за годам у 9 класах многіх школ зрываецца вывучэнне Талстога з-за адсутнасці на месцах праграмнага твора — рамана «Анна Каренина». Замест апошняга, Белдзяржвыдавецтва выдала «Войну и мир», які не праходзіцца ў школах.

Нельга супярэчыць супроць выдання «Войны и мира», «Пошехонской старины», «Истории одного города» і іншых класічных твораў. Хто даў, аднак, права Белдзяржвыдавецтву ў сваім выдавецкім плане абыходзіць патрабаванні сярэдняй школы, на якую яно павінна было ў значнай ступені арыентавацца, каб забяспечыць яе неабходнымі творамі па рускай літаратуры?

Не менш напружанае становішча стварылася з выкладаннем беларускай літаратуры, хрэстаматыйныя тэксты па якой школа ў гэтым годзе атрымала з вялікім спазненнем і то не для ўсіх класаў. Што-ж датычыць растлумачэння і разбору гэтых тэкстаў, а таксама вестак аб біяграфіях і творчасці пісьменнікаў, то тут настаўнікі і дзеці прадастаўлены цалкам самім сабе з-за поўнай адсутнасці падручнікаў і крытычных матэрыялаў.

Інстытут літаратуры Акадэміі навук, Наркамасветы і секцыя крытыкаў Саюза пісьменнікаў павінны спыніць сваю недапушчальную абыякавасць да гэтай справы, забяспечыць выданне хоць-бы да будучага навучальнага года добраякаснага стабільнага падручніка па беларускай літаратуры з прыцягненнем да яго складання лепшых настаўнікаў.

Па лініі Наркамасветы неабходна ажыццявіць рад мерапрыемстваў па павышэнню кваліфікацыі настаўнікаў літаратуры, частка якіх валодае далёка недастатковай адукацыйнай і метадычнай падрыхтоўкай. Ёсць на месцах, асабліва ў гарадскіх школах, і майстры педагагічнай справы, якія даюць добрыя ўзоры выкладання літаратуры.

Навукова-даследчаму Інстытуту школьнай педагогікі неабходна сумесна з Наркамасветы вывучыць і абагуліць вопыт лепшых настаўнікаў літаратуры, зрабіўшы яго здабыткам масавай школы, выдаць для апошняй метадычныя ўказанні па пытаннях выкладання. Існуючая пры інстытуце пісьмовая кансультацыя, якая абслугоўвае покуль толькі нязначную колькасць настаўнікаў, павінна быць пашырана і стаць масавай.

Справа гонару секцыі крытыкаў Саюза пісьменнікаў—забяспечыць у самы бліжэйшы час распрацоўку пытанняў беларускай літаратуры на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» і журнала «Полымя рэволюцыі» з арыентацыяй на тэматыку, прадугледжаную праграмай сярэдняй школы. У газеце «Літаратура і мастацтва» таксама трэба было-б неадкладна пачаць абмеркаванне пытання аб тым, якім павінен быць падручнік беларускай літаратуры, даць магчымасць выказацца па гэтаму пытанню пісьменнікам, крытыкам, настаўнікам і студэнтам.

І. ЗЕЛЬЦЭР.

„СЦЕЖКА ШПІЁНА“

(Прэм'ера Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР)

Французскі драматург Александр Дзюма (сын) — рэдкі госць у беларускіх тэатрах. І тое, што яго п'еса «Сцежка шпіёна» («Тропа шпиона») трапіла ў рэпертуар Рускага тэатра БССР, з'яўляецца амаль выпадкам. Але сугучнасць зместу яго твора з падзеямі нашага часу — паказ работы нямецкага шпіёна на тэрыторыі Францыі, а таксама выключнае драматургічнае майстэрства п'есы далі ўдзячны матэрыял калектыву Рускага тэатра для стварэння праўдзівага, напружана-захапляючага, простага спектакля.

Драматургія А. Дзюма адрозніваецца ад твораў яго сучаснікаў свежасцю тэм, вастрынёй сюжэта, смеласцю думак. Гэтыя асаблівасці рабілі п'есы пісьменніка ў свой час надзвычай злабадзённымі, актуальнасць іх часткова не страчана і да нашага часу.

Каштоўнасць п'есы «Сцежка шпіёна» ў тым, што яна правільна і паслядоўна раскрывае метады шпіянажу, якія ўжываліся агентамі нямецкай разведкі ў XIX стагоддзі. Совецкаму гледачу цікава параўнаць сёнешнюю агідную работу фашысцкіх дыверсантаў з мінулымі шпіёнскімі змовамі, бо яна мала чым адрозніваецца ад дзейнасці іх папярэднікаў.

А метады гэтыя наступныя. Шпіён нямецкай разведкі Кантаньяк абірае для выканання свайго задання блізкага да вынаходніка Клода Рупэ чалавека — яго жонку Цэзарыну. Праз яе Кантаньяк выведвае ўсё, што яму патрэбна. Цэзарына ў сваю чаргу выкарыстоўвае для сваёй работы закаханага ў яе Антаніна. Дзякуючы яго даверлівасці яна выкрадае з незгараемай шафы чарцяжы вынаходкі Клода. Шпіён уціраецца ў давер'е да самых блізкіх Клоду людзей і праз іх даведваецца аб засакрэчанай гармаце. П'еса пабудавана на дробных бытавых дэталях, якія з галавой выдаюць шпіёна і шляхі, якімі ён ідзе да выканання свайго плана.

Праўда, у драматургічным творы ёсць і небяспека — дынаміка дзеі і некаторыя рыскі меладраматызма маглі-б скіраваць тэатр з рэалістычнага шляху ў спектаклі на шлях дытэктыву, ад чаго ні тэатру, ні гледачу карысці не было-б. І добра, што Рускі тэатр абраў своеасаблівы прыём вырашэння падзей спектакля.

Не гледзячы на тое, што п'еса напісана ў плане трох класічных адзінстваў — месца, дзеі і часу, спектакль усё-ж па сваіх сцэнічных фарбах рознастайны. Пастаноўшчык, мастацкі кіраўнік тэатра А. Я. Данаці, не «мудруючы лукава», паставіў гэтую п'есу ў бытавым плане. Людзі на працягу дваццаці чатырох гадзін жывуць сваім асабістым жыццём, — у іх свае інтарэсы, свае справы, свае планы. У гэтым доме чалавек чалавеку—воўк. І зусім правільна робіць рэжысёр, калі ён надае спектаклю хуткі тэмп, — гэта стварае атмасферу яшчэ большай напружанасці. Усе кампаненты спектакля (акторскае выкананне, мастацкае афармленне і рэжысёрская работа) адзіны, падпарадкаваны аднаму заданню — ускрыццю метадаў нямецкага шпіянажу.

Цікавая ў спектаклі і трактоўка вобразаў. Выканаўцы стварылі арыгінальныя і своеасаблівыя вобразы, глыбока прадумаўшы паводзіны кожнага персанажа. Асноўныя два вобразы — Кантаньяк і Цэзарына — з'яўляюцца цэнтрам, вакол якога разгортваецца ўся дзея спектакля.

Кантаньяк прышоў у дом вынаходніка Клода Рупэ, як гаспадар. Ён пра ўсё і пра ўсіх тут ведаў, мог дасціпна выпытаць у абкружаючых яго людзей усё, што яму патрэбна. Але ў дачыненнях з імі ён трымаўся вельмі асцярожна: апасаўся, каб яго не западозрылі ў шпіянажы. Гэтыя два бакі вобраза Кантаньяка актор В. Я. Канаплянскі зрабіў тэзай і антытэзай. Маска — звычайнага чалавека, а сутнасць—шпіёна рабілі вобраз гэтага чалавека ненавісным і агідным. Ён грубы і патрабавальны ў адносінах да Цэзарыны, хітры і недаверлівы да абкружаючага асяроддзя. Гэтыя рысы актор выкарыстаў для знешняга і псіхалагічнага малюнка сваёй ролі. З выключным тактам акцэнтуе актор сваю ўвагу на аскетызме гэтага вышкаленага нямецкага бандыта.

Вобраз Цэзарыны, створаны актрысай А. В. Обуховіч, вонкава надзвычай яркі. Багацце рухаў, выключная здольнасць выкарыстоўвання іх, уменне акцэнтаваць творчую ўвагу на пэўнай групе найбольш характэрных рухаў і лейтматывам выкарыстоўваць іх на працягу ўсяго спектакля сведчыць аб выканаўчай культуры актрысы Обуховіч. Прадажная жанчына, якая не здолела стаць ні сумленнай маткай, ні адданай жонкай, а разам з тым не засталася і дзяўчынай, дала магчымасць шпіёну прыбраць яе да сваіх рук. Яна эгаістка, маральна нізкі чалавек. Такі змест гэтага вобраза. Але пры ўсіх гэтых якасцях дарэмна рэжысёр у апошнім акце прымушае актрысу качацца па падлозе, — неабходна знайсці больш рэальную мізансцэну, якая-б не дэзарганізавала, а, наадварот, яшчэ глыбей ускрывала азвярэлую ярасць Цэзарыны. І чым скрамней будзе мізансцэна, тым лепш.

Другая група вобразаў — вынаходнік Клод Рупэ, яго вучань Антанін, каханка Рэбека і служанка Эдмэ — вобразы сумленных людзей.

Клод Рупэ ў трактоўцы актора В. М. Траянскага — чалавек працавіты, які страсна любіць сваё вынаходніцтва. Ён быў-бы яшчэ больш праўдзівым, калі-б актор не дапусціў непраўдападобнасці ў інтанацыях (наглядаецца некаторая дэкламацыйнасць) і ў сцэнічных паводзінах (пазіроўка перад абкружаючымі). Воля гэтага чалавека і адданасць справе робяць вобраз Рупэ надзвычай чалавечным.

Антанін (Г. Е. Морэн) — адданы вучань, але яго ашукала Цэзарына, якую ён шчыра кахаў. Закаханы юнак, добрасумленны вынаходнік і нястомны памочнік Рупэ створан акторам у цёплых тонах. Абаяльнасць вобраза пакідае добрае ўражанне ў гледача.

І — нарэшце — дзве жанчыны.

Першую з іх, Рэбеку (З. В. Свінарская), цяжка запомніць. Хоць актрыса робіць гэтую ролю мякка, але сцэнічна гэты персанаж бяздзейсны. Са з'яўленнем Рэбекі на сцэне паяўляюцца і жаночая цеплыня і клопаты аб Клодзе, — пачынае гучаць непрыкметная ўнутраная бытавая лірыка. Але, на вялікі жаль, актрыса выпукляе ў гэтым вобразе неўласцівы яму сум, яна робіць Рэбеку тыповай меладраматычнай каханкай. Жаночая абаяльнасць павінна быць дамінуючай якасцю вобраза Рэбекі.

Другая—служанка Эдмэ. Гэта адзіны дэмакратычны прадстаўнік у доме Клода. Актрыса Т. В. Бондарава даволі праўдзіва перадала ўсе абаяльныя і шчырыя пачуцці гэтай простай чорнаскурай дзяўчыны, якая паслухмяна і аддана служыць свайму гаспадару.

Акторскі калектыў і рэжысёр справіліся з сваімі задачамі. Яны рэальна, а гэта значыць правільна, раскрылі сутнасць персанажаў А. Дзюма.

Поспеху спектаклю спрые і мастацкае афармленне М. П. Лорыса. Не гледзячы на тое, што ўсе тры акты паказу ідуць у адных дэкарацыях, глядач усё-ж нікольні не сумуе. Павільён зроблен мастаком у рэальным плане і досыць добра абыгрываецца акторамі. А самае галоўнае, што як спектакль пастаўлен у бытавым плане, так і афармленне зроблена бытавое, гэта значыць, што думкі рэжысёра і мастака адзіны.

Фашысты забараняюць п'есы Дзюма, таму што ў іх выкрываюцца метады нямецкага шпіянажа, якія жывы і да гэтага часу, таму што творы Дзюма агітуюць супроць вайны. У «Сцежцы шпіёна» абедзве гэтыя праблемы знайшлі сваё яркае адлюстраванне, таму спектакль — патрэбны нам мастацкі твор.

А. ЕСАКОЎ.

П'еса А. Дзюма «Сцежка шпіёна» у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР у пастаноўцы А. Я. Данаці. НА ЗДЫМКУ: арт. А. Б. Обуховіч у ролі Цэзарыны, арт. В. М. Канаплянскі ў ролі Кантаньяка.

БОЛЬШ ДАПАМАГАЦЬ МАЛАДЫМ РЭЖЫСЁРАМ

(„Дзеці Ванюшына“ у пастаноўцы Віцебскага гарадскога тэатра)

Вырошчванне маладых рэжысёраў самімі тэатрамі, прыцягненне да рэжысёрскай работы актораў—важнейшы шлях да ўзбагачэння тэатраў рэжысёрскімі кадрамі. Як прыклад добрага падыходу да высоўвання новых рэжысёрскіх сіл, трэба адзначыць тое, што апошнія пастаноўкі Віцебскага гарадскога драматычнага тэатра — гэта работы маладых, вырасшых у тэатры рэжысёраў. Акторам З. Вялікім пастаўлена п'еса «Агні маяка», акторам Ц. Сяргейчыкам — «Дзеці Ванюшына».

Зразумела, што пастаноўка, якую робіць малады рэжысёр, не павінна быць па свайму мастацкаму ўзроўню ніжэй астатніх работ тэатра. Справа гонару мастацкага кіраўніцтва, усяго калектыва тэатра так працаваць, так дапамагаць маладому рэжысёру, каб глядач атрымаў высокамастацкі, культурны спектакль. І вось у гэтых адносінах Віцебскі драмтэатр з'явіцца прыкладам ужо не можа. Апошнія пастаноўкі тэатра, зробленыя маладымі рэжысёрамі, па сваіх мастацкіх якасцях стаяць ніжэй папярэдніх работ тэатра. Возьмем, напрыклад, пастаноўку п'есы С. Найдзёнава «Дзеці Ванюшына».

«Дзеці Ванюшына» — лепшая п'еса дарэволюцыйнага рускага драматурга С. Найдзёнава. У гэтай п'есе С. Найдзёнаў дае завостраны і праўдзівы малюнак жыцця, быту купецкай, чыноўніцкай Расіі канца мінулага стагоддзя, раскрывае агіднейшае кутро «цёмнага царства». Аўтар будуе драму на канфлікце бацькоў і дзяцей. Дзеці купца Ванюшына, узгадаваныя ў духу сваіх бацькоў, на прыкладах подласці, распусты, драпежніцтва — ганебных прыкладах старэйшага пакалення, выраслі тыповымі прадстаўнікамі свайго асяроддзя.

Старэйшы сын Ванюшына — Канстанцін наследуе ад бацькі драпежнасць, жорсткасць, прагнасць да багацця і дапаўняе гэтыя рысы адсутнасцю ўсякіх прынцыпаў маралі, сумленнасці, нават простай чалавечнасці. Следам за Канстанцінам ідзе і брат яго Аляксей. Але гэта больш складаны вобраз. Аляксей урэшце пачынае разумець парокі свайго асяроддзя, свае і абкружаючых. Ён дапамагае бацьку ўбачыць сапраўдную гніласць купецкага быту. Чыноўнік Шчоткін — дробны інтрыган, нікчэмны чалавек. Яго жонка — старэйшая дачка Ванюшына — ва ўсім падобна да свайго мужа. У гэтым-жа духу выхоўваюцца і меншыя дочкі Ванюшына — гімназісткі Аня і Каця. Галерэю тыпаў дапаўняе ганарлівая генеральша Кукарнікава і яе дачка Інна — разбэшчаная і хітрая паненка.

Вось асноўныя персанажы п'есы С. Найдзёнава. Месца дзеі — дом Ванюшына, дом распусты, подласці, інтрыг.

Купец Ванюшын на старасці год, нарэшце, убачыў страшную праўду жыцця на «верхнім паверсе»—жыцця сваіх дзяцей. Але ён ужо не можа змяніць становішча. І канфлікт з дзецьмі канчаецца самагубствам старога Ванюшына. Самагубства гэта не азначае гібелі ўстояў старога жыцця. Дзеці Ванюшына ідуць сцежкай сваіх бацькоў, свайго асяроддзя, свайго класа. С. Найдзёнаў толькі жадае ўказаць на парокі сучаснага яму грамадства, крытыкуе, абураецца, але рэволюцыйных вывадаў не робіць.

Але паколькі С. Найдзёнаў дае яркі, тыповы, завострана-крытычны малюнак сучаснага яму грамадства, дык рэалістычная пастаноўка яго п'есы на нашай сцэне — разгорнуты паказ страшнага мінулага — выклікае ў нашага гледача разуменне непазбежнасці гібелі гэтага грамадства, эксплаататарскіх класаў царскай Расіі.

Значыць, задача рэжысёра заключалася ў тым, каб стварыць рэалістычны, праўдзівы спектакль, паказаць гледачу тыповых прадстаўнікоў змецёных соцыялістычнай рэволюцыяй класаў царскай Расіі — купцоў, чыноўнікаў.

У такім плане і імкнуўся паставіць п'есу Ц. М. Сяргейчык. Але гэта ў поўнай меры яму не ўдалося. Не ўдалося перш за ўсё таму, што акторы — выканаўцы асноўных ролей—не стварылі тыповых, яркіх вобразаў.

Вобраз старога купца Ванюшына досыць бледны, неперакануаўчы. Актор Ц. Сяргейчык не знайшоў патрэбных сродкаў для таго, каб у першых актах паказаць сілу, дэспатычнасць, самаўпраўнасць «самога»—Ванюшына. Ванюшын крычыць, пагражае, але гэта не стварае ўражання. Залішне старым, сумятлівым, істэрычным зрабіў Ванюшына актор у першых актах. Таму не даходзіць патрэбным чынам да гледача драматызм канфлікту Ванюшына з дзецьмі, яго надлом, прывёўшы да самагубства. Не данесена да гледача тое, што сістэма жыцця, створаная Ванюшынымі, выносіць ім-жа самім прысуд, не раскрыта ў дастатковай меры ўнутраная гніласць асноў грамадства Ванюшыных. А ў гэтым — галоўная вартасць п'есы.

Актрыса М. Стройская, якая выконвае ролю старой маці купецкай сям'і — жонкі Ванюшына, стварыла гэты вобраз прыёмамі ўжо надакучыўшых гледачу сцэнічных штампаў. Характэрных рысаў для раскрыцця вобраза актрыса не знайшла. Больш выразна трэба акрэсліць і вобраз Аляксея актору С. Казлову. Ён надзвычай аднастайны ва ўсіх дзеях. Актор не прасачыў унутранага развіцця вобраза ў п'есе, не раскрыў гледачу, як і чаму Аляксей здолеў зразумець гніласць, подласць жыцця дома Ванюшыных. Таму ўчынкі і словы Аляксея ў апошніх актах здаюцца гледачу неапраўданымі. Не вырашыла задачы стварэння вобраза Елены—маладой дзяўчыны, жыццё якой разбіў, пакалечыў дом Ванюшыных, — актрыса І. Бялая. Актрыса павінна паказаць трагізм жыцця Елены, раскрыць вобраз ва ўсіх яго супярэчнасцях. Больш глыбокая распрацоўка гэтай ролі дапаможа ярчэй паказаць агіднае абліччя старэйшых патомкаў Ванюшына.

Нядрэнна справіліся з ролямі сясцёр-гімназістак актрысы Л. Гепнер і М. Маркоўская. Трэба толькі адзначыць залішняе захапленне актрысай М. Маркоўскай вонкавай камедыйнасцю, аднастайнымі жэстамі, мітуслівасцю без патрэбы, шаржыраваннем.

Цэльны, тыповы вобраз чыноўніка Шчоткіна стварыў актор П. Іваноў. Інтрыган і падхалім, чалавек з подленькай душонкай — Шчоткін, абмалёван акторам у патрэбным, некалькі сатырычным, плане. Увогуле правільна распрацавана акторам З. Вялікім роля Красавіна, адзіны ідэал якога—грошы, уласная каляска «на гумовых шынах», — прыказчыка, які выбіваецца ў купцы. Найбольшая акторская ўдача ў гэтым спектаклі — вобраз экономкі Аўдоцці. Простай, але ўдумлівай ігрой актрыса Л. Мазалеўская стварыла цікавы вобраз азлабленай жанчыны, якую засмактала, як балота, жыццё дома Ванюшыных, хоць яна і разумее яго парокі. Добра выконваюць эпізадычныя ролі генеральшы Кукарнікавай актрыса Е. Радзялоўская, яе дачкі Інны — актрыса Р. Кашэльнікава.

Галоўнай няўдачай у спектаклі з'яўляецца недапрацаванасць, слабасць асноўных вобразаў п'есы, недастатковае раскрыццё пастаноўшчыкам канфліктаў драмы С. Найдзёнава. Адсюль — зніжэнне вартасці пастаноўкі. Спектакль не пакідае таго глыбокага ўражання, якога глядач мог чакаць ад п'есы С. Найдзёнава. Недапрацаванасць спектакля сведчыць аб адсутнасці патрэбнай дапамогі мастацкага кіраўніцтва тэатра і ўвагі ўсяго яго калектыва да гэтай работы маладога рэжысёра.

Р. ЮРЫН.

ДРАМАТЫЧНЫ КАЛЕКТЫЎ БУДАЎНІКОЎ

Драматычны калектыў віцебскага клуба будаўнікоў існуе з 1925 года.

За гэты шматгадовы перыяд калектыў прайшоў вялікі творчы шлях. Упарта працуючы над падняццем свайго культурнага ўзроўню і авалоданнем тэхнікай акторскага майстэрства, калектыў дасягнуў значных поспехаў у сваёй рабоце.

У сучасны момант рэпертуар драматычнага калектыва складаецца з лепшых п'ес совецкіх драматургаў і класікаў. У рэпертуары: «Васа Жэлезнова» М. Горкага, «Без віны вінаватыя» А. Астроўскага, «Платон Крэчэт» Карнейчука і іншыя п'есы.

Драматычны калектыў навучыўся сур'ёзна працаваць над спектаклем, ствараць праўдзівыя рэалістычныя вобразы. Мы заўсёды былі супроць фармалістычных фокусаў, супроць надуманых фальшывых тлумачэнняў і імкнемся для кожнай п'есы знайсці праўдзівую рэалістычную форму.

Апошняя наша работа — «Вочная стаўка» Л. Шэйніна і бр. Тур, якую мы падрыхтавалі да 20-гадовага юбілею Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У сучасны момант драматычны калектыў працуе над п'есай «Зямка Копач» Даніэля. Гэта — п'еса на тэму аб гераічнай барацьбе Чырвонай Арміі з белапалякамі.

У калектыве ёсць група рабочых-будаўнікоў, якія працуюць у галіне мастацкай самадзейнасці 10—12 год. Гэта маляр тав. Генькін, буфетчыца тав. Клячко, пячнік тав. Бараноўскі, будаўнік тав. Будняцкі, служачыя тт. Шабашэва, Мальчык, рабочыя-будаўнікі тт. Перах, Рэвелісаў. Драматычны калектыў ставіць сваёй далейшай задачай стварэнне высокаякасных праўдзівых спектакляў, якія адпавядалі-б высокім патрабаванням нашага рабочага-гледача.

Мастацкі кіраўнік драматычнага калектыва будаўнікоў А. УР'ЕЎ.
Віцебск.

НЕБОЛЬШЭВІЦКАЯ КРЫТЫКА

18 лютага газета «Советская Белоруссия» з неўласцівай для большэвіцкага друку развязнасцю выступіла з артыкулам з поваду змешчанай ў нашай газеце рэцэнзіі на спектакль «Вочная стаўка» у пастаноўцы Белдзяржрдрамтэатра. Пакідаючы покульшто ў баку дыскусію адносна канкрэтнай ацэнкі самога спектакля, разбярэмся ў тых палітычных абвінавачаннях, якія аўтар рэдакцыйнага артыкула «з лёгкасцю ў мыслях незвычайнай» кідае нашай газеце, яўна **абрадаваўшыся** выпадку «разнесці і распяць».

Што справа абстаіць іменна так — чытач убачыць сам, калі прачытае рэцэнзію самой «Советской Белоруссии» на памянёны спектакль (20 лістапада 1937 года), у якой актору С. Бірыла (следчы Ларцаў) было заўважана, мякка кажучы, на тое, што яму

«яўна нехапае пачуцця меры. Залішняя мітуслівасць, непатрэбна напышлівы, дэкламацыйны тон дыялага — **усё гэта не дае праўдзівага ўяўлення аб фігуры совецкага следчага-комуніста**».

Як бачым, спектакль, у абарону якога накіраваны зараз стрэлы «Советской Белоруссии», ёю самою ацэнены не вельмі высока. Бо следчы Ларцаў з'яўляецца цэнтральным станоўчым вобразам у п'есе і ад таго, наколькі правільна актор трактуе гэты вобраз, залежыць якасць усяго спектакля.

Можна, зразумела, згаджацца ці не згаджацца з нашай ацэнкай спектакля, можна спрачацца па асобных палажэннях ацэнкі, можна знаходзіць і палітычную памылковасць асобных месц, на прыкладах даводзячы гэта чытачу. Але нельга кідаць нічым **неабгрунтаваныя** палітычныя абвінавачанні як асобным работнікам, так і ўсёй рэдакцыі нашай газеты. Гэтага, на нашу думку, яшчэ не зразумела «Советская Белоруссия». Апёкшыся на некалькіх справах «выкрыцця», шэльмуючы сумленных людзей, рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия» зараз, палемізуючы з нашай газетай, нават не ўказвае чамусьці прозвішча нашага рэцэнзента. Чаму? «Советская Белоруссия» «ничтоже сумняшеся» паклёпнічае на ўсю газету. Шаноўныя таварышы з «Советской Белоруссии» не разумеюць, што гэта яшчэ ў большай меры забаронена пастановай Пленума ЦК ВКП(б).

Разбярэмся ў палітычных абвінавачаннях, кінутых нам.

Першае абвінавачанне. У адным з перадавых артыкулаў нашай газеты быў ужыты тэрмін «бойкія маладыя людзі». Тэрмін гэты вядомы ўсякаму мала-мальска граматнаму чалавеку. Ён адносіцца да **пэўнай катэгорыі** людзей. Гэтым тэрмінам не адзін раз карысталіся такія пісьменнікі, як М. Е. Салтыкоў-Шчэдрын, А. М Горкі, карыстаецца ім наш большэвіцкі друк. Аднак рэспубліканскай газеце «Советская Белоруссия» ён невядомы. Прычапіўшыся да гэтага тэрміна, паставіўшы пытанне на-галаву, аўтар рэдакцыйнага артыкула «Советской Белоруссии» прад'явіў нам абвінавачанне, што нашай газетай «усе маладыя людзі аднесены к лагеру ворагаў народа» (!?) З якога пальца вы гэта высмакталі, паважаны аўтар артыкула? Дзе вы вучыліся так спрытна падтасоўваць факты, выдаючы сваю непісьменнасць за палітычныя памылкі іншых?

Вось што сказана ў нас у газеце:

«Шмат прынеслі шкоды беларускаму народу бойкія маладыя людзі — «чыноўнікі ад мастацтва», «разбойнікі друку» і «машэннікі пяра», якія дзеля сваёй кар'еры гатовы адрачыся ад бацькі і маці. Жанглюючы словамі «айчына», «радзіма-маці», яны прадавалі нашу краіну агулам і ў розніцу японагермана-польскаму фашызму. На выкрыццё і ліквідацыю рэштак гэтай нечысці павінны быць накіраваны ўсе нашы сілы. Прадажным фашысцкім сабакамі няма месца на совецкай зямлі».

Дзе-ж тут аднясенне **ўсіх** маладых людзей да ворагаў народа? Таварыш Столін! З якога часу так павялося, што рэдактар (хоць-бы і часова выконваючы абавязкі), высоўваючы такое абвінавачанне другой совецкай газеце, не патрабуе «падсудны» нумар газеты і не прачытвае яго сам, перш чым прад'яўляць абвінавачанне, тым больш у рэдакцыйным артыкуле?

Зусім зарапартаваліся таварышы з «Советской Белоруссии». Ці не адносяцца толькі нашы крытыкі (аўтары артыкула ў «С. Б.») да тых людзей, пра якіх яшчэ стары Салтыкоў-Шчэдрын пісаў: «Баюся я гэтых бойкіх маладых людзей, якія дзеля кар'еры гатовы адмовіцца ад бацькі і маці, якія, так сказаць, ледзь выйшаўшы з пялёнак, патрасаюць ужо ўказальным пярстом, нібы пагражаючы нябачанаму ворагу: вось я цябе!».

Другое абвінавачанне. «Советская Белоруссия», прарэцэнзаваўшы **адзін** нумар нашай газеты, без **адзінага** пацвярджэння прад'яўляе газеце «Літаратура і Мастацтва» усяго толькі такое абвінавачанне: «Замест выкрыцця ворагаў — агульнае ахайванне сумленных совецкіх людзей. Замест выхавання кадраў — стаўка на тое, каб перабіць іх» (?!). На падставе чаго робіцца такі вывад? Гэтае дзікае сцвярджэнне не пацверджана ні адзіным фактам. Калі-б крытыкі з «Советской Белоруссии» былі сур'ёзнымі людзьмі, яны-б, асабліва пасля рашэння студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б), пасля амаль штодзённых артыкулаў у «Правде» аб крыкунах і паклёпніках, не кідаліся-б з такой лёгкасцю падобнымі «абвінавачаннямі». Не большэвіцкі гэта стыль работы.

Нам мімаволі ўспамінаецца аналагічны факт, калі газета «Советская Белоруссия» выступіла з «аглядам» газеты Чэрвеньскага раёна «Калектывіст» і, зрабіўшы дзікія абагульненні, ашэльмавала газету.

А каму невядома, што часамі старонкі газеты «Советская Белоруссия» прадастаўляліся цяпер выкрытым ворагам народа, якімі сапраўды былі ашэльмаваны сумленныя совецкія людзі. Рэдакцыя «Советской Белоруссии» замест большэвіцкага прызнання і выпраўлення дапушчаных памылак сарамліва аб іх умоўчвае.

Трэцяе абвінавачанне. «Замест дзелавой і рэзкай крытыкі брыдот, якія твораць ў Саюзе пісьменнікаў, бесталковы лепет». Калі-б крытыкі з «Советской Белоруссии» былі больш сумленнымі і прачыталі рэцэнзуемы нумар газеты (заўважце, — вывады «С. Б.» зроблены на падставе **аднаго** нумара), яны-б не апынуліся ў такім няёмкім становішчы. Нават у разглядаемым «Советской Белоруссией» нумары нашай газеты змешчаны матэрыялы, якія па-дзелавому крытыкуюць работу Саюза пісьменнікаў. Рэдакцыйныя артыкулы «Арганізаваць творчую работу» і «Больш клопатаў пра маладыя літаратурныя кадры», артыкулы тт. Якуба Коласа, М. Клімковіча, Г. Камянецкага ды інш. крытыкі з «Советской Белоруссии» не толькі не прачыталі, а нават «не заўважылі». Мякка кажучы, гэта не зусім добрасумленна.

Чацвертае абвінавачанне. Газету «Літаратура і Мастацтва» разносяць за тое, што яна нібыта перш надрукавала нарыс тт. В. Вольскага і А. Кучара «Беларуская совецкая літаратура за 20 год», а потым яго раскрытыкавала. Па-першае, газета не друкавала ўсяго нарыса, а змясціла некалькі ўрыўкаў з яго (да ведама «С. Б.»: увесь нарыс—каля пяці друкаваных аркушоў — змешчаны ў журнале «Полымя Рэволюцыі»), а, па-другое, наша рэзкая крытыка адносіцца да паасобных мясцін яго—якраз у тых раздзелах, якія зусім не друкаваліся ў газеце.

Падагульняючы падтасаваныя факты, крытыкі з «Советской Белорусии» шматзначна заяўляюць, што «справа ідзе не аб выпадковых памылках, а аб пэўнай парочнай лініі газеты (!?) Гучна сказана, але неперакануаўча. Зусім дарэчы будзе запытацца ў нашых крытыкаў, ці маюць яны хоць якое-небудзь уяўленне аб лініі, калі так лёгка кідаюцца такімі абвінавачаннямі?

Так крытыкі з «Советской Белоруссии» прыгатавалі блюда, а ч.в.а. рэдактара гэтай газеты тав. Столін, апрабіраваўшы і праштампаваўшы яго, стаў у позу ўрача і паднёс нам гэтую «стряпню» у якасці лякарства. На гэта мы можам толькі адказаць: «Врачу, исцелися сам...»

А цяпер аб рэцэнзіі тав. А. Есакова на спектакль «Вочная стаўка», якая была змешчана ў нашай газеце. У рэцэнзіі ёсць паасобныя пераўвелічэнні, залішняя рэзкасць. Няправільнае сцвярджэнне тав. Есакова, што «поўнакроўныя вобразы совецкіх людзей мала каму з беларускіх актораў удаюцца».

Спектакль «Вочная стаўка» — патрэбны совецкаму гледачу мастацкі твор, але над пастаноўкай яшчэ шмат трэба працаваць, каб стварыць поўнакроўны спектакль аб гераічнай барацьбе нашага народа, верных яго сыноў—слаўных чэкістаў супроць японa-германа-польскіх шпіёнаў і дыверсантаў.

«Вочная стаўка» нават у такім выглядзе, у якім яна ідзе зараз, робіць карысную для нас справу, мабілізуючы наш народ на барацьбу супроць ворагаў народа. Але спектакль быў-бы куды больш дзейсным, калі-б у п'есе былі больш акрэслены станоўчыя вобразы. Людзі, якія не хочуць бачыць недахопаў спектакля, робяць мядзвежую паслугу тэатру.

Газету «Літаратура і Мастацтва» трэба крытыкаваць. У нас ёсць недахопы, памылкі, вялікія і малыя, мы яшчэ не навучыліся так ставіць пытанне, як іх ставіць Ц. О. нашай партыі «Правда», але шэльмаваць газету нікому не дадзена права. Мы будзем толькі ўдзячны газеце «Советская Белоруссия» за дзелавую большэвіцкую крытыку нашай газеты, што дапаможа ў барацьбе за партыйнасць у мастацтве.

Газета «Літаратура і Мастацтва» ахвотна будзе прыслухоўвацца і вучыцца ў газеты «Советская Белоруссия», калі яна па-большэвіцку будзе ставіць пытанні літаратуры і мастацтва, як гэта робіць «Правда». Але гэтага покуль-што няма. Узнятыя «Праўдай» важнейшыя пытанні аб барацьбе з фармалізмам і шмат іншых зусім абыйдзены газетай «Советская Белоруссия». Рэдакцыя гэтай газеты, трымаючыся, відаць, небольшэвіцкага пагляду—«як-бы чаго не вышла?..», за апошні час амаль зусім перастала займацца пытаннямі мастацтва.

Паўтараем, мы будзем толькі ўдзячны ўсім тым, хто пакажа нам на нашы недахопы і памылкі. Гэта толькі дапаможа ў рабоце газеты. Агульнае-ж ахайванне газеты не прынясе ніякай карысці. Абвінавачанні, якія прад'яўлены нашай газеце «Советской Белоруссией» — не па адрасу накіраваны. Мы вяртаем іх у адрас адпраўвіцеля.

РАСЦЕ ПОПЫТ НА МУЗЫЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

Матэрыяльны добрабыт рабочага, служачага, калгасніка паляпшаецца з кожным годам. Культурныя запросы павышаюцца. Расце попыт на культтавары, на музычныя інструменты.

Белпрамгандаль, які абслугоўвае 11 гарадоў, прадаў у 1936 годзе 1.505 шчыпковых інструментаў (балалайкі, мандаліны, гітары), а ў 1937 годзе — 4110. Піяніна прададзена адпаведна 72 і 153, баянаў і венскіх гармонікаў — 130 і 368, патэфонаў 970 і 2.732. Адных грампласцінак прададзена ў 1937 годзе 146.740 замест 57.140 у 1936 годзе.

Але гэтыя лічбы не адлюстроўваюць сапраўднага попыту. Фактычна попыт на музычныя інструменты, патэфоны і радыёпрыёмнікі перавышае рэалізацыю ў тры-чатыры разы.

Вялікі попыт на музычныя інструменты наглядаецца ў калгаснай вёсцы. Спажывецкая кааперацыя рэалізавала ў 1937 годзе ў сельскіх мясцовасцях звыш 40 піяніна, 2000 патэфонаў, 40 камплектаў інструментаў для духавых і домрава-балалаечных аркестраў, 1000 гармонікаў, 2.700 радыёпрыёмнікаў.

Надзвычай характэрны малюнак уяўляюць сабой лічбы росту рэалізацыі музычных інструментаў у вёсцы за апошнія чатыры гады. Так, у 1934 годзе было рэалізавана музычных інструментаў на 67.000 рублёў, у 1935 годзе — на 378.000 рублёў, у 1936 годзе — на 1.752.000 рублёў, у 1937 годзе — на 2.298.000 рублёў, гэта значыць — рост у параўнанні з 1934 годам амаль **у 40 разоў.**

П—н.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята—25-394, рэдактара—20-831. Уп. Галоўлітбела № 4237